№ 41 (351) 7 лістапада 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Сяргей Калякін**

Ня трэба займацца бальшавізмам.

старонка 3

**Праваслаўны сьвятар**

Стварыў першы беларускі падручнік па астраноміі.

старонка 12

**Элем Клімаў**

Як здымалі «Ідзі і глядзі».

старонка 12

## Шампанскае пасажыру «Таксі-22222»

**5 лістапада пасьля месячнага перапынку, зьвязанага з канфіскацыяй аўтамабіляў і галадоўкай пратэсту, аднавіла працу ваўкавыскае «Радыётаксі-22222».** Мінтранспарту, якое 20 кастрычніка прыпыніла ліцэнзію прадпрыемства на месяц, вярнула яе пасьля пратэсту пракуратуры. Першы кліент патэлефанаваў у фірму аб 11.09. І таксовец прывёз яму ў падарунак бутэльку шампанскага. Падрабязнасьці на старонцы 5.

## МУС чакае скарачэньне

**Структура Міністэрства ўнутраных справаў будзе рэфармаваная.** Паводле словаў А.Лукашэнкі, у цэнтральным апараце МУС працуе тысяча чалавек, а дзяржбюджэт ня можа дазволіць сабе ўтрымліваць такія груваcткія структуры.

## Тозік будзе чысьціць канал

**Кантроль за рэканструкцыяй закінутай беларускай часткі Аўгустоўскага каналу даручаны старшыню Камітэту дзяржкантролю Анатолю Тозіку.** У XVIII ст. канал ствараўся як водная дарога для перавозкі грузаў па Вісьле і Нёмане да Балтыйскага мора. Цяпер ён можа стаць прывабным маршрутам для замежных турыстаў, як гэта даўно ёсьць у Польшчы.

## Грузінская апазыцыя ідзе на абвастрэньне

**У сераду працоўную рэзыдэнцыю Шэварднадзэ ачапілі жаўнеры ўнутраных войскаў у бронежакетах.** У Тбілісі працягваюцца мітынгі апазыцыі, якая аспрэчвае абвешчаныя вынікі парлямэнцкіх выбараў. Лідэры Нацыянальнага руху і блёку «Бурджанадзэ-Дэмакраты» патрабуюць правядзеньня перавыбараў у чатырох гарадах або адстаўкі прэзыдэнта Шэварднадзэ. Мяркуецца, што сьпікерка парлямэнту Ніно Бурджанадзэ або лідэр самае папулярнае па выніках выбараў апазыцыйнае партыі «Нацыянальны рух» Міхаіл Саакішвілі стануць кандыдатамі ад апазыцыі на прэзыдэнцкіх выбарах 2005 г.

## У кіраўніка Кампартыі КНР зяць-мільянэр

**Дачка Ху Цзіньтао, кіраўніка Кампартыі Кітаю, таемна выйшла замуж.** Такую інфармацыю падае Asian Wall Street Journal. Абраньнікам 33-гадовай Ху Хайцінь стаў на сем гадоў старэйшы мільянэр Дэніэл Мао, былы мэнэджэр фірмы — уласьніцы найбольшага кітайскага інтэрнэт-парталу. Кітаянка восем гадоў навучалася ў ЗША пад чужым прозьвішчам і рэгулярна падавала дакумэнты на атрыманьне пасьведчаньня на правы жыхарства. Сакрэтны шлюб быццам бы адбыўся яшчэ ў верасьні на Гаваях, але вядома пра гэта стала толькі цяпер. Бацька нявесты трымае паўзу — ён часьцяком зьвяртаўся да аднапартыйцаў і іх дзяцей-бізнэсоўцаў з заклікам жыць сьціпла.

**СМ; БелаПАН**

## Падпіска

**Нагадваем, што падпісацца на газэту** можна на любы куточак Беларусі. Цана падпіскі на месяц — **2043** рублі. На шапік «Белсаюздруку» — усяго **1360** рублёў. Падпіску прымаюць ва ўсіх аддзяленьнях пошты, у шапіках «Белсаюздруку». Дык падпісвайся!

# Пасьля акупацыі

У Беларусі нарэшце зьняты паўнавартасны эўрапейскі фільм



WWW.PARTISANFILM.NAROD.RU

Старонка 14

# Сцэнар для дэмакратычнага ўраду

Так, чатырма словамі, можна ахарактарызаваць кнігу «Беларусь: сцэнары рэформаў». У складаньні яе бралі ўдзел беларускія палітолягі ды эканамісты, а таксама замежныя экспэрты. Куратары праекту — дырэктар Беларускага калегіюму Алесь Анціпенка і рэдактар часопісу «Arche» Валер Булгакаў. Сцэнаром можа скарыстацца любы ўрад, незалежна ад яго палітычнай плятформы.

Заходная пазыцыя аўтараў «сцэнару» — неабходнасьць інтэграцыі Беларусі ў Эўропу. Прапанаваныя рэформы павінны прывесьці Беларусь да адпаведнасьці мінімальным патрабаваньням Эўразьвязу да краінаў-кандыдатак.

Рэформы тычацца ўсіх сфэраў. Напрыклад, ідэал палітычнага ладу краіны для складальнікаў кнігі — парлямэнцка-прэзыдэнцкая рэспубліка, у якой прэм’ер і Саўмін адказныя толькі перад парлямэнтам. Апошні з «палаты» мусіць ператварыцца ў «Сойм». Прадугледжваецца таксама ўвядзеньне мясцовага самакіраваньня, рэформа выбарчага заканадаўства, зьмены ў судовай сыстэме (міравыя судзьдзі замест народных засядацеляў), скасаваньне сьледчых падразьдзяленьняў МУС, КДБ, пракуратуры, дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў. Прапануецца ўвесьці прыватную адвакатуру. КДБ мае быць пераназваны ў службу нацыянальнай бясьпекі, міліцыя — у паліцыю...

Рэформы ў эканоміцы — прыватызацыя, забесьпячэньне свабоды прадпрымальніцкай дзейнасьці, пераход да свабодных цэнаў, разьвіцьцё малога і сярэдняга бізнэсу, падатковая рэформа, рэструктурызацыя прамысловасьці (гіганты цяжкай прамысловасьці стануць маёмасьцю буйных замежных кампаній). У сацыяльнай сфэры — пераход да сыстэмы сацыяльнага страхаваньня праз разьвіцьцё пэнсійных фондаў і страхавой мэдыцыны. Больніцы, напрыклад, прапануецца акцыянаваць і перадаць у валоданьне працоўным калектывам. Паліклінікі таксама будуць пераведзеныя на платную аснову. Пры гэтым мае быць уведзеная сыстэма сямейна-спэцыялізаванай мэддапамогі — людзі самі змогуць выбіраць сабе доктара.

Валер Булгакаў зазначыў, што сцэнары распрацаваныя на доўгатэрміновую пэрспэктыву. Алесь Анціпенка папярэдзіў: калі рэформы праводзіць запозьнена, за іх давядзецца заплаціць нашмат больш. Але ўсё ж «спазьніцца з рэформамі немагчыма».

Працяг на старонцы 5.

# Гавал у абарону ліцэю

**Былы прэзыдэнт Чэхаславаччыны Вацлаў Гавал выступіў у абарону навучэнцаў зачыненае незалежнае беларускамоўнае школы, вымушаных займацца на кватэрах. Сябры бацькоўскае Рады ліцэю атрымалі ад яго ліст.**

Шаноўныя і дарагія сябры бацькоўскае Рады,

Я вельмі ўдзячны вам за давер, якім вы абдарылі мяне ў сваім допісе.

Паверце, я добра паінфармаваны пра сытуацыю ў Беларусі — і з афіцыйных, і зь неафіцыйных крыніцаў. Я ведаю пра ціск цяперашняга палітычнага рэжыму на сьвядомых грамадзянаў, пра пасьлядоўную русіфікацыю і зьнішчэньне беларускіх школаў, а таксама пра ліквідацыю ліцэю імя Якуба Коласа. Я гэтым моцна абураны, бо тут ідзецца пра гвалт, скіраваны супраць вашай нацыянальнае самабытнасьці.

Я належу да народу, што ў сваёй гісторыі некалькі разоў быў на мяжы зьнікненьня, бо ворагі — свае і замежныя — скіроўвалі сваю нянавісьць супраць элітаў, веры, культуры і адукацыі. Чэскі народ знайшоў у сабе сілу і меў шчасьце пераадолець усе тыя перашкоды — хоць часта і коштам адставаньня ў цывілізацыйным разьвіцьці. Не сумняваюся, што й беларусы змогуць знайсьці спосаб захаваць у неспрыяльны час нацыянальную ідэнтычнасьць наперакор афіцыйнай уладзе.

Як вы ведаеце, прыблізна год таму чэскае Міністэрства замежных справаў адмовіла выдаць Аляксандру Лукашэнку ўязную візу. Гэта было ў тую пару, калі пяцьдзясят найзначнейшых палітыкаў ціснулі ў Празе адзін аднаму рукі. Я быў згодны з такімі дзеяньнямі чэскага МЗС і лічу, што гэта адзін з найлепшых спосабаў дзеяньня міжнароднае супольнасьці ў такіх выпадках. Аляксандар Лукашэнка ў лік дэмакратычных палітыкаў ня трапіў.

Паверце мне, што вашая сытуацыя не перастане турбаваць мяне і што пры кожнай нагодзе я буду пра яе распавядаць як маральным аўтарытэтам, гэтак і тым, хто знаходзіцца ва ўладзе ў Эўропе.

На заканчэньне прашу вас перадаць мае сардэчныя вітаньні тым, хто бароніць дэмакратыю, і засьведчыць маю падтрымку ўсім, хто змагаецца за захаваньне беларускай самасьвядомасьці.

**Ваш**
**Вацлаў Гавэл**

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

## Крок наперад, два крокі насустрач

Пакуль Эўропа ня мае яснае стратэгіі ў дачыненьні да Беларусі, прыезды Уты Цапф не выклікаюць нічога, апроч іроніі. Балазе прозьвішча ў яе прыгожае…

Мне давялося пагутарыць зь сябрам камісіі ПАСЭ па беларускім пытаньні. Ён прызнаў, што думкі адносна далейшае стратэгіі ў дачыненьні да Беларусі падзеленыя. Адны мяркуюць, што Эўропа павінна першая зрабіць крок насустрач. Другія лічаць любое падвышэньне статусу Беларусі патураньнем дыктатару, які, да таго ж, якраз дэманстратыўна зачыняе ўсе недзяржаўныя арганізацыі, здольныя арганізаваць незалежнае назіраньне за выбарамі. Трэція, як літовец Чакуоліс, займаюць прамежкавую пазыцыю. Маўляў, напрошвацца няма сэнсу, але на любы крок Менску ў кірунку дэмакратызацыі трэба ўдзячна адказваць. У Беларусі больш не зьнікаюць людзі, а апазыцыянэры не сядзяць у турмах. О’кей. У Беларусі не фармуецца сямейны ўладны клан. Таксама о’кей. «Заўжды ёсьць што прапанаваць дыктатару ўзамен за дэмакратызацыю. Але калі дзяржава зь яе эканомікай пераходзіць у рукі сям’і, гэта фатальна», — кажа гэты дэпутат зь невялікай эўрапейскай краіны.

Карацей, Эўропа чакае яскравых хадоў беларускага боку. Напрыклад, адмены папярэдняга галасаваньня як такога. Эўрапейцы гатовыя рабіць два крокі насустрач на кожны беларускі.

**Андрэй Дынько**

# Ірак не здаецца

Дзьве ядравыя дзяржавы — ЗША і Расея — загрузьлі ў Іраку і Чачэніі. Апошні ўік-энд быў чорным для абедзьвюх. Гібель шаснаццаці амэрыканцаў у зьбітым пад Фалуджай гелікоптэры змусіла завагацца самых цьвёрдых прыхільнікаў далейшае пацыфікацыі Іраку. Расейцы за выходныя страцілі трыццаць жаўнераў, прычым ня толькі ў гарах, а і ў раўніннай частцы Чачэніі.

Калі вайна ў Чачэніі застаецца недаступнай для чужых вачэй, дык танцы радасьці іракцаў вакол зьнішчаных амэрыканскіх джыпаў дэманструюць усе сусьветныя тэлеканалы. Становішча ясна: Ірак неўзабаве адновіць свой сувэрэнітэт, а замежныя войскі будуць выведзены з краіны. У сваю чаргу, Расеі прыйдзецца прызнаць незалежнасьць Чачэніі. Фактычна мы назіраем паразу ідэі, папулярнай апошнім часам сярод расейскіх і амэрыканскіх палітолягаў. На іх думку, у цяперашнім сьвеце нацыянальны сувэрэнітэт падлягае натуральнаму і непазьбежнаму абмежаваньню, калі ўлады нейкай дзяржавы маюць праблемы з эфэктыўным кіраваньнем.

Сьвет застаецца шматпалоснай аўтастрадай, на якой кожная нацыя рухаецца ня толькі з сваёй хуткасьцю, але часам і ў адрозным ад астатніх напрамку.

**Барыс Тумар**

# Глушчакі за незалежнасьць, але супраць начальства

Інстытут сацыялёгіі Акадэміі навук па выпадковай выбарцы зладзіў апытаньне жыхароў Глуску і прылеглых вёсак — Заполья і Хвастовіч. На 180 пытаньняў анкеты адказалі 18 чалавек: пэнсіянэры, службоўцы, рабочыя. Іх сярэдні ўзрост складае 51 год.

Большая частка анкетаваных выказалася за захаваньне сувэрэнітэту Беларусі. Палова лічыць, што Беларусь павінна быць незалежнай і будаваць свае адносіны з Расеяй на аснове міжнародных дамоваў, больш за трэціну ўпэўненыя, што краіны павінны ўтварыць раўнапраўны зьвяз з стварэньнем нацыянальных органаў кіраваньня, а дзясятая частка жыхароў гэтага самага ўсходняга раёну краіны выказалася за тое, каб Беларусь увайшла ў склад РФ.

Трэціна ўдзельнікаў апытаньня станоўча глядзяць на пляны ўвядзеньня ў Беларусі расейскага рубля ў якасьці адзінай валюты, столькі ж — супраць, і трэціна абыякава паставілася да гэтага пытаньня ці мела цяжкасьці з адказам.

Амаль тры чвэрці рэспандэнтаў ацэньваюць матэрыяльнае становішча сваёй сям’і як кепскае, і толькі чвэрць — як сярэдняе. Большай частцы апытаных грошай хапае толькі на неабходныя прадукты харчаваньня і вопратку, а 25% адказалі, што сем’і часьцяком адмаўляюцца нават ад неабходных прадуктаў харчаваньня і вопраткі. Амаль палова анкетаваных канстатавала, што матэрыяльнае становішча іх сям’і за апошні год пагоршылася ў параўнаньні зь мінулым годам.

Віну за такую сытуацыю глушчакі ўскладаюць на прадстаўнікоў мясцовае ўлады — ім не давярае каля паловы апытаных. Прэзыдэнту 50% рэспандэнтаў давяраюць, у той жа час не давярае дзясятая частка; трэціна не змагла адказаць на гэтае пытаньне. Яшчэ менш даверу да Саўміну, нацыянальнага сходу, судовых органаў, міліцыі. У гэтым шэрагу стаяць і дзяржаўныя СМІ. У той жа час дзьве трэціны анкетаваных давяраюць праваслаўнай царкве. Больш як тры чвэрці — войску. І толькі дваццатая частка, паводле апытаньня, давярае апазыцыі, у той час як палова апытаных выказала ёй недавер.

**Ігар Кірын, Глуск**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Кожнаму сваё



Дайце нам камсамол 80-х з сэксапільнымі сакратаркамі ў ласінах

У Беларусі хелаўіну шырока не адзначаюць. Сьвята нячыстай сілы падмяніла 85-я гадавіна камсамолу. Шыкам лічыліся куфайкі брыгадзіраў будатрадаў, пыльныя шлемы камісараў і г.д. Дэфіле зацягнутых у скуру сяброў ЛКСМБ да помніка правадыру нагадвала шэсьце ралевікоў з клюбу «Паўночны дракон», вечарына ў Палацы Рэспублікі — карнавал.

Разынкай «хелаўіну» стала спрэчка за спадчыну: ЛКСМБ і БРСМ вызначалі, хто зь іх сапраўдны нашчадак Паўкі Карчагіна. «А ў нас на сьцягу, як у ВЛКСМ, — партрэт Леніна», — казаў камсюк Яненка. «А мы робім больш добрых справаў», — адпасоўваў рэспубліканец Арда.

Калі б мы жылі ў нармальнай капіталістычнай дзяржаве, з спрэчкі выйшаў бы супэрпрацэс, які б не саступаў цяжбе паміж былымі бітламі за аўтарскія правы на песьню «Давай зробім гэта проста зараз». Саламонавым рашэньнем было б падзяліць легенду камсамолу. Няхай Яненка возьме сабе песьню «Бьется в тесной печурке огонь», а Арда — «Мой адрес — Советский Союз». Хоць я б на іх месцы змагаўся за правa прайвайдэра міту аб Сяргею Бярдзюгіну, украінскім камсамольцу, які памёр на тым тыдні ў адэскай турме. На кічу ён трапіў за спробу абрабаваць банк, а пасьля раздаць грыўні галодным докерам Малдаванкі.

Тыя, каго запіхнулі ў камсамол у час перабудовы, таксама маюць свае законныя правы на шматок легенды аб камсамоле. Дайце нам камсамол 80-х з сэксапільнымі сакратаркамі ў ласінах, вэрніце камсоргаў, якія трымалі ў інтэрнатах відэакропкі. Хачу паслухаць даклад лектара з райкаму ВЛКСМ аб тым, што захапленьне гуртам «Metallica» выклікае ступар у мазгах.

Да наступнага хелаўіну, прабачце, гадавіны камсамолу, абавязкова набуду касьцюм куміра камсамольцаў 80-х — трыко як у Бруса Лі.

**Лёлік Ушкін,**
левы тусоўшчык

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Дзяды на Кулiковым полі

Зь лексыкону інфармацыйных праграм радыё зьнік адыёзны сымбаль непаўнавартасьці — словазлучэньне «наша рэспубліка». Гадамі не маглі безь яго гаварыць пра Беларусь дыктары, журналісты, іншыя фігуранты выпускаў навін — і раптам усе забыліся. Беларусь перайменаваная з «рэспублікі» ў «краіну», і пастанова выконваецца з выключнай стараннасьцю. Беларускай музыкі пабольела. Але рабіць на гэтай падставе нейкія абагульненьні ня варта.

Калі абагульняць, дык у шырэйшым кантэксьце. У які павінны ўваходзіць і дэманстрацыйнае сьвяткаваньне юбілею камсамолу, і замоўчваньне чорнага дня беларускай літаратуры — расстрэлу вялікай групы творчай інтэлігенцыі акурат у той самы дзень. Варта дадаць і партрэты Сталіна, якія з розных выпадкаў каторы тыдзень гасьцююць на стэндах Гарадзенскай абласной бібліятэкі (а бібліятэкары ня менш старанна і паслухмяныя за журналістаў Беларускага радыё), і пару сьцягоў: расейскі ды беларускі — на доме па вул.Савецкай/Дамініканскай.

Дзяды, напаўпрызнанае сьвята, у дзённым інфармацыйным выпуску ўпэўнена выводзяцца ад памінаньня палеглых на Куліковым полі: прапагандысцкая машына атрымала санкцыю на дэманстрацыю дзяржаўнага статусу Беларусі, але не адступілася ад намеру кшталтаваць Беларусь паводле ўзору, які спалучае пашану да камуністычна-савецкага зь піэтэтам перад расейска-праваслаўным. Расея і расейцы па-ранейшаму застаюцца адзіным прапагандысцкім арыенцірам для Беларусі.

Чаму тады «прызналі» Беларусь краінай, чаму праз расейскую папсу прабіваецца ў этэр беларуская музыка? Ня ўсё тлумачыцца незадаволенасьцю ўладаў інтэграцыйнымі працэсамі. Адмова ад навязьлівай «рэспублікі» — сымбалю падначаленьня Маскве — нічога ня зьменіць у перамовах пра акцыянаваньне «Белтрансгазу» ды пра пераход краіны на чужую валюту. Сарамлівае прызнаньне ўласнае дзяржаўнасьці ня можа выклікаць хуткага зруху ў грамадзкай сьвядомасьці. Ды ўлада і не імкнецца спарадзіць гучнае выяўленьне нацыянальных пачуцьцяў — дастаткова параўнаць з рэакцыяй Украіны на расейскую дамбу ля Тузлы.

Варты свайго найменьня палітык ніколі не адмовіцца ад дзейснага сымбалю, тым больш перад абліччам складанай эканамічнай ці палітычнай праблемы. Чарговае паслабленьне прарасейскіх настрояў у высокіх кабінэтах вывела да публічнасьці тыя заваёвы нацыянальнага руху, якія сапраўды адбыліся. Насуперак ціску на «трэці сэктар», нягледзячы на бясконцыя ўдакладненьні законаў пра шэсьці і мітынгі, тое беларускае, што існуе не віртуальна, знаходзіць шлях да розумаў насельніцтва. Часам нават там, дзе, здавалася б, татальны ідэалягічны кантроль і нікага праходу няма.

У беларусаў ёсьць музыка і ёсьць дзяржава — гэта сумненьняў не выклікае, бо прысутнічае ў штодзённым жыцьці ў выглядзе несумненных для шараговага грамадзяніна праяваў. Хочацца нават сказаць, дасягненьняў. Добра было б, калі б тое самае можна было сказаць пра сьвяты, навуку, літаратуру. Наколькі спрасьцілася б праца стваральнікаў дзяржаўнай ідэалёгіі! Не было б патрэбы шукаць апору ў Сталіну ды на Куліковым полі, да якога дзяды нашыя па волі падступнага Ягайлы не дайшлі: ня мог князь вызначыцца, чый бок узяць. Адвеку з гэтым у князёў праблемы.

**Аляксандар Карольчык**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сярод лідэраў апазыцыйнай «пяцёркі-плюс» сваёй магутнай постацьцю вылучаецца кіраўнік камуністаў Сяргей Калякін. Ён слухае Уладзімера Высоцкага, любіць кнігі «з сэнсам» і абяцае калісьці сам напісаць мэмуары «пра рэальныя падзеі, у якіх удзельнічаў». Я гутарыў зь ім у яго сьціплым кабінэце на Акадэмічнай: стол літарай «Т», шафы з творамі айцоў-заснавальнікаў, канапы, кандыцыянэр. Ёсьць чырвоны сьцяг, а вось партрэта Леніна нешта не відаць…**

## Сяргей Калякін:

# Ня трэба займацца бальшавізмам

**Сяргей Калякін:** Затое ў мяне ёсьць працы Леніна, яны стаяць у шафе побач з творамі Маркса і Энгельса.

**«НН»: Як Вы ставіцеся да сёньняшняй дзяржаўнай сымболікі?**

**С.К.:** Магу сказаць, што яна не савецкая. Мала таго, яна яшчэ і адвольна зьменена ўжо пасьля падвядзеньня вынікаў рэфэрэндуму 1995 г. Мы лічым, што былая савецкая сымболіка была сымболікай першай самастойнай беларускай дзяржавы, утворанай у 1919 г.

**«НН»: Стоп, а як жа БНР пад штандарам бел-чырвона-белым?**

**С.К.:** Магчыма, праблему дзяржаўнай сымболікі ў будучым трэба абмеркаваць у грамадзтве. І ня варта сьпяшацца. Бо трэба зрабіць так, каб дзяржаўная сымболіка стала роднай для кожнага грамадзяніна Беларусі. На сёньняшні момант гэта другаснае пытаньне, у параўнаньні з тым, як зрабіць годным жыцьцё нашых людзей. І калі цяпер нашая «пяцёрка-плюс» пачне вырашаць, які сьцяг выбраць у якасьці сьцягу кааліцыі, мы рассыплемся!

**«НН»: Слухаю Вас і дзіўлюся: у сярэдзіне 90-х ніхто й падумаць ня мог, што камуністы будуць «у адным фляконе» з Народным Фронтам!**

**С.К.:** Ды мяне б тады, каб убачылі разам зь Вячоркам, папросту выгналі б з партыі! У 90-я праз абсалютна тупую пазыцыю часткі чыноўнікаў зь бюракратычнага апарату КПБ Народны Фронт «за перабудову» «Адраджэньне» ператварыўся ў антыкамуністычную сілу. У пачатку 90-х з боку фронтаўцаў ня раз чулася: «Камуністаў трэба вешаць на слупах». Рэакцыя была адэкватнай. Калі вас людзі хочуць павесіць на слупе, вы зь імі цалавацца ня будзеце.

Прайшоў час. Стала зразумела, што ніхто нікога вешаць ня будзе, а камуністы, прыйшоўшы да ўлады, ня стануць ліквідоўваць дзяржаўнасьць Беларусі і беларускую культуру.

**«НН»: І што, з Фронтам сёньня поўны кансэнсус?**

**С.К.:** Ёсьць сур’ёзныя разыходжаньні, адно зь іх — адносіны Беларусі і Расеі. Мы выступаем супраць таго, каб Беларусь была паглынутая якой-небудзь краінай, хоць бы і Расеяй. Мы заўсёды казалі, што Беларусь павінна быць сувэрэннай дзяржавай, аб’ектам міжнароднага права. Доўгі час нашым стратэгічным саюзьнікам была і ў будучым застанецца Расея. Фронтаўцы ж лічаць, што асноўным стратэгічным партнэрам павінна быць аб’яднаная Эўропа.

> Калі вас людзі хочуць павесіць на слупе, вы зь імі цалавацца ня будзеце

**«НН»: А зь іншымі калегамі па «пяцёрцы» якія разыходжаньні?**

**С.К.:** Мы будзем крытыкаваць праект альтэрнатыўнага бюджэту, падрыхтаваны АГП. Ён для нас непрымальны! У адрозьненьне ад лібэралаў, ня лічым, што сёньня трэба пазачыняць буйныя прадпрыемствы. Гэтак мы створым у краіне масавае беспрацоўе, якое зьмяце дэмакратычны лад. І зноў прыйдзе дыктатура, як цяпер. Трэба спачатку стварыць новыя рабочыя месцы, у тым ліку і за кошт разьвіцьця малога і сярэдняга бізнэсу. Ня трэба займацца бальшавізмам у эканоміцы. Хоць гэта мо і дзіўна гучыць з вуснаў першага сакратара партыі камуністаў...

**«НН»: Дарэчы, пра бальшавізм. Мы сустракаемся напярэдадні 7 лістапада. Што значыць для Вас гэтая дата сёньня?**

**С.К.:** Адносіны да гэтага дня ў мяне не зьмяняліся. 7 лістапада адбылася вялікая сацыяльная рэвалюцыя. Яна дазволіла Беларусі, празь некалькі стагодзьдзяў няволі, зноў вярнуць дзяржаўнасьць. Зразумела, што ня ўсе ідэі, якія ляжалі ў аснове рэвалюцыі, былі рэалізаваныя, былі дапушчаныя сур’ёзныя адступленьні ад іх. Аднапартыйная сыстэма, адсутнасьць плюралізму і многае іншае і прывялі да таго, што сацыялістычны пэрыяд разьвіцьця краіны скончыўся ў 1991 г.

**«НН»: ...але і цяпер ёсьць дастаткова ахвотных зладзіць судовы працэс над камунізмам.**

**С.К.:** Гэта экстрэмісцкі падыход. З такім жа посьпехам цяпер можна судзіць капіталізм — згадаць усіх яго ахвяраў, пачынаючы ад буржуазных рэвалюцыяў. Альбо царкву, якая таксама зьдзейсьніла гіганцкую колькасьць злачынстваў (праўда, каталіцкі касьцёл ужо пакаяўся)...

Адным з элемэнтаў разьвіцьця гісторыі заўсёды быў гвалт. Судзіць ідэалёгію бессэнсоўна. Трэба вывучаць гісторыю, зь яе рабіць высновы, вучыцца і рухацца наперад.

**«НН»: Значыць, камуністы ўжо ня тыя?**

**С.К.:** На зьездзе нашай партыі ў траўні была прынятая новая рэдакцыя партыйнай праграмы. Сёньня вырашэньне праблемаў праз узброеныя змовы немагчымае і непатрэбнае. Гісторыя той жа кастрычніцкай рэвалюцыі паказала, што яна можа зламаць існы стан рэчаў, але будаўніцтва новага жыцьця — гэта працэс эвалюцыйнага разьвіцьця.

Але з другога боку, бязь зьменаў палітычнай сытуацыі ў краіне, безь вяртаньня яе на дэмакратычны шлях разьвіцьця нельга вырашыць ні эканамічных, ні сацыяльных, ні замежнапалітычных праблемаў. Таму мы і ўдзельнічаем у кааліцыі пяці партыяў ды спрабуем яе ўсяляк пашыраць.

**«НН»: А шараговыя сябры ПКБ — аднагалосна падтрымліваюць удзел у кааліцыі?**

**С.К.:** Па-рознаму. Большасьць разумее, што сёньня трэба аб’яднаць высілкі. Тым ня менш, некаторыя нашыя людзі гавораць: «Як можна працаваць з Станіславам Шушкевічам — віноўнікам развалу Савецкага Саюзу?! Ён зрабіў гэта, ня маючы ніякіх паўнамоцтваў».

**«НН»: І што Вы ім адказваеце?**

**С.К.:** Што ў Вярхоўным Савеце XII скліканьня 85% дэпутатаў былі сябрамі КПСС. І яны прагаласавалі за Белавескія пагадненьні.

**«НН»: Некаторыя партыі ўжо рыхтуюцца да прэзыдэнцкіх выбараў...**

**С.К.:** У мяне часам пытаюцца: чаму мы зацыкліліся на парлямэнцкай кампаніі і ня ставім пытаньня пра прэзыдэнцкую? Мы абмяркоўвалі гэтую праблему. Я называў прыклад Статкевіча. Ён адразу вызначыў сябе як пэрсону, на якую ўсе павінны працаваць. А мы сабралі ўжо вялікі спэктар сілаў, які будзе працаваць на перамогу. Кандыдата ў прэзыдэнты нельга прызначыць. Ён мусіць зьявіцца сам, і, магчыма, гэта адбудзецца вельмі хутка. Можа, нават яшчэ да будучых парлямэнцкіх выбараў. Калі нам удасца правесьці групу людзей у парлямэнт і падчас работы там, у рамках сыстэмнай апазыцыі, праявяцца людзі, якія здолеюць пасьля стаць лідэрамі нацыі. Задача ў тым, каб за гэтым чалавекам пайшлі ня 10—15 працэнтаў выбарцаў, за ім павінна пайсьці большая частка насельніцтва краіны.

> Кандыдата ў прэзыдэнты нельга прызначыць. Ён мусіць зьявіцца сам

**«НН»: Многія ня вераць, што Лукашэнка ў выпадку паразы на выбарах аддасьць уладу. Калі ласка, рэцэпт ад Калякіна: як вярнуць людзям аптымізм і веру ў перамогу?**

**С.К.:** Рэжым Лукашэнкі і нашая сытуацыя — не ўнікальныя ў сусьветнай гісторыі. Іншыя краіны ўжо прайшлі праз гэта, сталі свабоднымі і дэмакратычнымі. Трэба займацца стварэньнем альтэрнатыўных крыніцаў інфармацыі, ствараць масавы рух, які й мае стаць крыніцай распаўсюду інфармацыі, ахопліваць усю краіну і ўсё насельніцтва. Стварыць альтэрнатыву. Каб людзі маглі сказаць, што за гэтай сілай, за гэтымі людзьмі, за тым, што яны прапануюць, трэба ісьці. Людзі павінны нам паверыць.

Лукашэнка нам ня быў прысланы зь нябёсаў. Яго прыдумалі і зрабілі такім, якім ён ёсьць, беларускія людзі. І як бы ён ні чапляўся за ўладу, у іх ёсьць усе магчымасьці, каб дапамагчы Лукашэнку сысьці. Пытаньне ў тым, ці будзе ў людзей жаданьне прымусіць яго гэта зрабіць. На жаль, пакуль у грамадзтве большасьць хоча, каб ён сышоў, але нічога ня хоча дзеля гэтага рабіць... Вячаслаў Кебіч у 1994-м таксама нікуды не хацеў сыходзіць, але нічога ня змог зрабіць, бо быў адрынуты грамадзтвам. Такі ж лёс у найбліжэйшы час чакае Лукашэнку. Сёньня ўжо міністры, работнікі сілавых структураў, на якія ён абапіраецца, кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў, культурная эліта адмаўляюць тое, што робіцца ў нашай краіне. Але яны баяцца гаварыць. Мы ж павінны стаць каталізатарам, які дасьць магчымасьць гэтаму ўсяму закіпець.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

# Дзьмітры Яненка:
# Гэта не БССР


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пра сёньняшні камсамол карэспандэнт «НН» гутарыць зь першым сакратаром ЦК ЛКСМБ Зьмітром Яненкам.**

**«НН»: У камсамол Вы ўступілі ў 1990-м. А я якраз тады зь яго выйшла. Дакладна ведаю, чаму так зрабіла. А Вы?**

**Дзьмітры Яненка:** Камуністычныя ідэі мне блізкія. Камсамол — добрая арганізацыя. Нэгатыў у яе гісторыі ня можа пераважыць станоўчыя бакі.

**«НН»: Была ў вашым родным Салігорску акурат 29 кастрычніка. Ён аж трапеча ад сьвяточных камсамольскіх транспарантаў. Менск увесь у профілях Леніна й БРСМ-аўскіх расьцяжках. Усё пярэстае, колеру літоўскага сьцягу ці растафары. Чаму вас не запрасілі на гэтае сьвята жыцьця?**

**Дз.Я.:** Улада баіцца прызнаць, што ў краіне існуе камсамол — не БРСМ, а Ленінскі камуністычны саюз моладзі, зь якім зьвязанае мінулае вэтэранаў, шмат каго зь цяперашніх кіраўнікоў дзяржавы.

**«НН»: На вашай сымболіцы профіль Леніна. Але гэты чалавек аддаваў загады зьнішчаць людзей цэлымі клясамі.**

**Дз.Я.:** Ён адыграў у гісторыі вялікую ролю — пабудаваў сацыялістычную дзяржаву ў капіталістычным сьвеце, якім тады была Расея. Што тычыцца расстрэлаў, дык трэба ведаць, з чым гэта было зьвязана. Нельга вырываць нейкія дзеяньні з кантэксту. Можа, і нашыя ўнукі скажуць, што мы ня мелі рацыі й мусілі дзейнічаць інакш. Увогуле ж мы супраць таго, каб гінулі людзі, каб іх забівалі й саджалі ў турмы.

**«НН»: І ўсё ж галоўны закід да камуністаў: для вас чалавечае жыцьцё — не абсалютная каштоўнасьць...**

**Дз.Я.:** Сёньня для нас чалавечае жыцьцё — найвышэйшая каштоўнасьць.

**«НН»: А клясавыя ідэалы яе ня засьцяць?**

**Дз.Я.:** Мы выступаем за пабудову бясклясавага грамадзтва, але не падтрымліваем тэзы, што для гэтага трэба зьнішчаць людзей.

**«НН»: Лукашэнка пабудаваў ідэальную БССР. Чаму вы ня зь ім?**

**Дз.Я.:** Гэта не БССР. Нам гэтая мадэль не падабаецца. З 1996 г. ЛКСМБ у апазыцыі. Гэтае рашэньне мы прынялі напярэдадні рэфэрэндуму. Мы лічым, што гэты лад не дае разьвівацца маладому чалавеку.

**«НН»: Але ж камуністы мелі прыхільнасьць да аўтарытарных формаў кіраваньня…**

**Дз.Я.:** Не, рашэньні камуністы прымалі калектыўна. Іншая справа, што тады ў краіне не было шматпартыйнай сыстэмы. Цяпер камсамол выступае за шматпартыйнасьць, дэмакратыю. Мы — адзіная беларуская арганізацыя, якая ўваходзіць у склад Сусьветнай фэдэрацыі дэмакратычнай моладзі, мы сябры Рады Асамблеі няўрадавых арганізацыяў.

**«НН»: Што для вас Беларусь? Самастойная краіна, частка Эўразьвязу, частка Расеі?**

**Дз.Я.:** Незалежнасьць Беларусі — зьдзейсьнены факт. Мы бачым Беларусь незалежнай, свабоднай, дэмакратычнай дзяржавай, якая не ўваходзіць ні ў якія хаўрусы, але жыве ў згодзе й супрацоўніцтве з усімі краямі сьвету.

### Не падабаецца, што грошы робяцца богам

**«НН»: А як наконт беларускай мовы й культуры** (суразмоўца гаварыў па-расейску, але на гэтае пытаньне адказаў на някепскай беларушчыне. — **С.К.**)?

**Дз.Я.:** Мы з павагаю ставімся да беларускай культуры й мовы. Але паколькі я яе кепска ведаю, не хачу прыпадабняцца да нашага вядомага палітыка, які палову словаў прамаўляе на расейскай, а палову на беларускай.

**«НН»: Якая ў вашай партыі «мэтавая група»? На каго арыентуецеся?**

**Дз.Я.:** Мы ніколі не дзялілі моладзі на студэнтаў, школьнікаў, рабочых і вяскоўцаў. Радыя бачыць у сваіх шэрагах усіх, каму ідэалы справядлівасьці й дабра блізкія. Прымаем у камсамол добраахвотна, глядзім, што за чалавек: прымаць — не прымаць? У нас структуры ёсьць у кожнай вобласьці, 36 рэгіянальных арганізацыяў. Колькасьць сяброў удакладнім на сёлетнім зьезьдзе, але паводле леташніх зьвестак іх 1011. Сярэдні век — 24 гады.

**«НН»: А не было спакусы «паружавець»?**

**Дз.Я.:** Летась перад зьездам думалі: ці не пераназвацца нам у «новых левых» альбо БАРС — «Беларускую асацыяцыю рыцараў справядлівасьці»? Маўляў, моладзь ня йдзе пад шыльду камуністычнай арганізацыі. Я лічу, зьмена шыльды нічога ня дасьць. Трэба працаваць з моладзьдзю, і той, каму спадабаецца ў камсамоле, застанецца.

**«НН»: Камуністы заўсёды стараліся зьмяніць нешта ў сьвеце — на лепшае, як яны лічылі. Што б вам хацелася зьмяніць?**

**Дз.Я.:** Мне недаспадобы, што сьвет цяпер аднаполюсны. Ёсьць дзяржава, якая лабіруе свае інтарэсы ва ўсім сьвеце часам праз войны. Нам не падабаецца, што грошы робяцца богам, якому людзі моляцца. Мы б хацелі, каб агульнапрызнаныя чалавечыя каштоўнасьці стаялі найвышэй.

**«НН»: А якія стасункі ў сучасных камсамольцаў з сапраўдным Богам?**

**Дз.Я.:** Мы — за свабоду веравызнаньня. У нас шмат сяброў, якія вераць у Бога. Але асабіста я — атэіст. Свайго пункту гледжаньня нікому не навязваю.

*Доўгі і нудны спыніўся дапрос. На разьвітаньне сп.Яненка падараваў мне газэту «Таварыш» і фірмовую асадку — з профілем Леніна й адрасам электроннай пошты www. komsomol@tut.by. Мы паціснулі адно аднаму рукі.*

**«НН»: У гэтыя ж дні, на Дзяды 1988-га, я й падумаць не магла, што нацыяналісты будуць у адным кошыку з камуністамі. Што ж зьмянілася за гэтыя гады?**

**Дз.Я.:** Мы зразумелі, што Беларусь на ўсіх адна, і мы хочам бачыць яе незалежнай, дэмакратычнай і сапраўды талерантнай — каб усім было месца.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

### ДАВЕДКА «НН»

**Дзьмітры Яненка** — першы сакратар ЦК Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Ленінскі камуністычны саюз моладзі Белоруссіі» (менавіта так зарэгістравана Мінюстам). Нарадзіўся 31 сакавіка 1975 г. у Салігорску, у сям'і бібліятэкаркі й шахцёра. Цяпер студэнт юрфаку Беларускага камэрцыйнага інстытуту кіраваньня. Нежанаты. У вольны час грае ў футбол.

# Ад НКВД да БРСМ

З 27 кастрычніка ў галоўным будынку БДУ пачала працаваць фотавыстава, прысьвечаная 85-й гадавіне ВЛКСМ. Экспазыцыя не абмяжоўваецца савецкім часам. У адным шэрагу стаяць здымкі бравых сталінцаў, брэжнеўска-гарбачоўскіх ленінцаў ды сяброў БПСМ і БРСМ. Здымкаў заходнебеларускіх камсамольцаў, якія сапраўды змагаліся за нацыянальнае адзінства і сацыяльныя правы, на выставе няма.

Побач з уласнымі выявамі бээрэсэмаўцы павесілі — безь ніякіх камэнтароў — здымкі з пасяджэньняў Вучонае рады ўнівэрсытэту і нават фота рэктара Аляксандра Казуліна. Матывацыя — некалі рэктар працаваў у камсамольскіх структурах. Гэта не здымае пытаньня пра правамернасьць выкарыстаньня прадстаўнікоў унівэрсытэцкай адміністрацыі для рэклямы асобных грамадзкіх аб'яднаньняў. Кіраўнікі ж мусяць быць нэўтральнымі фігурамі. Дый БРСМ не самавольнічаў, павесіўшы гэтыя здымкі. Людзі, адлюстраваныя на іх, хутчэй ганарацца, чым шкадуюць пра сваё «камсамольскае юнацтва», задаволена пасьміхаюцца, разглядаючы сябе на старых фатаграфіях.

Адзін з арганізатараў выставы — дырэктар Цэнтру інфармацыйных тэхналёгіяў БДУ Юры Варатніцкі — паказаны ледзь не на дзясятку здымкаў у розных паставах, але зь нязьменна адданым аблічам. Ён надзвычай непапулярны сярод студэнтаў, бо займаўся экспэрымэнтамі па ўвядзеньні электронных студэнцкіх білетаў. На выставе можна даведацца пра карані гэткіх зацікаўленьняў: як сьведчыць подпіс да аднаго са здымкаў, менавіта Варатніцкі ў юнацтве стварыў «праграму па праверцы камсамольскага актыву».

Студэнты іранічна ставяцца да агітпрапу ВЛКСМ-БРСМ. Але ня ўсе: нехта паклеіў сьцены, прылеглыя да выставы, зялёнымі налепкамі незарэгістраванага «Беларускага рэвалюцыйнага саюзу моладзі» з выявай Мао і заклікамі «хунвэйбініць Лукашэнку» ды ажыцьцяўляць іншыя антысацыяльныя дзеяньні. Ці новы «БРСМ» захунвэйбініў выставу, ці адбылося нешта іншае, але ўжо ў пятніцу яе пабачыць было немагчыма, дарма што абвесткі абяцалі экспазыцыю да 3 лістапада.

Дарэчы, пра абвесткі. Студэнты прынесьлі адну зь іх у рэдакцыю, і высьветлілася, што яна надрукаваная на адваротным баку Пляну ідэалягічнай работы.

**Сяргей Прытыцкі**



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

## ПАЛІТЫКА ЗА ТЫДЗЕНЬ

Пакуль апазыцыйныя сілы ствараюць кааліцыі, Аляксандар Лукашэнка вядзе пазыцыйныя баі на ўсходнім фронце (апошні — з Чубайсам у «Свабодзе слова») ды шукае хаўрусьнікаў. Нават расейскія аналітыкі прагназуюць магчымасьць утварэньня беларуска-ўкраінскага «сытуацыйнага альянсу, які будзе знаходзіцца ў канфрантацыі да Масквы». Сідорскі і Януковіч ужо канструктыўна перамовіліся адносна вяртаньня ўкраінскае запазычанасьці й ратыфікацыі дамовы пра дзяржаўную мяжу. Сама сытуацыя прымушае Лукашэнку і Кучму ісьці насустрач адзін аднаму і шукаць паразуменьня. Выступіўшы адзіным блёкам, яны маглі б зьмяніць геапалітычную сытуацыю ва Ўсходняй Эўропе. У выпадку пазытыўнага разьвіцьця беларуска-ўкраінскіх адносінаў Украіна магла б лабіраваць беларускія інтарэсы ў эўраструктурах. Лукашэнка пакуль не скандуе крамольнага лёзунгу «Беларусь — у Эўропу!», у якога ёсьць непрыстойны працяг, але заўсёды падкрэслівае «шматвэктарнасьць беларускай палітыкі».

А на наступны дзень пасьля этэру «Свабоды слова» ў Беларусі паўстала Эўрапейская кааліцыя «Свабодная Беларусь». Аж два дзясяткі арганізацыяў і ініцыятываў ды дзьве партыі — БСДП (НГ) і «Надзея» — падпісаліся пад дэклярацыяй. І як бы стваральнікі кааліцыі ні даводзілі, што яны — не канкурэнты «пяцёркі-плюс», — гэта відавочна. Палітоляга Алеся Лагвінца зьдзівіла адсутнасьць на прэзэнтацыі Эўракааліцыі замежных партнэраў. Чамусьці не завітала на імпрэзу Ута Цапф, што якраз гасьцявала ў Менску. Прычынаў, лічыць Лагвінец, можа быць дзьве: альбо замежныя партнэры ня лічаць Эўракааліцыю і ўступленьне Беларусі ў ЭЗ актуальнымі, альбо ставяцца да новай кааліцыі зь перасьцярогай. Спн.Цапф дык увогуле выказала спадзяваньне на тое, што Мікола Статкевіч хутка далучыцца да «пяцёркі».

«Зубр» і «Малады фронт», яшчэ гады два назад зацятыя канкурэнты, цяпер «сябруюць супраць» «пяцёркі-плюс». А вось стварэньне Эўракааліцыі абедзьве арганізацыі падтрымалі, хоць і не ўвайшлі ў яе. «Мы хочам бачыць адзіны дэмакратычны блёк, — кажа лідэр «Зубра» Ўладзімер Кабец. — Стварэньне Эўракааліцыі лічым важнай зьявай. Але ўсё залежыць ад партыйнай «пяцёркі» і яе амбіцыяў». Але ці пачуюць голас Кабца? Уплыў і сіла «зуброў» ды МФ далёка не такія, як раней. Адпаведна, зьнізілася і цікавасьць прэсы да іх. На апошняй па часе прэс-канфэрэнцыі «Маладога фронту» прысутнічалі толькі два журналісты.

Пакуль дзьве апазыцыйныя кааліцыі дзейнічаюць кожная на сваім фронце, паміж якімі асобны ўчастак мае моладзь. Кожная імкнецца прыцягнуць да сябе як мага больш структураў, рэальных і віртуальных. Не абыходзіцца без падзелаў. Так, прадпрымальніцкая арганізацыя «Пэрспэктыва» Шумчанкі наладжвае кантакты зь «пяцёркай-плюс», а падобная арганізацыя «Прыватная ўласнасьць» Малахава ўжо ўвайшла ў Эўракааліцыю.

**Алег Тачоны**

# Цыбуля, загорнутая ў Біблію

**Канфэрэнцыя «Змагары за веру сустракаюцца з моладзьдзю», якую ладзіў незарэгістраваны «Малады фронт», прайшла ў найлепшых традыцыях дысыдэнцтва.**

Удзельнікі сабраліся ў прызначаным месцы (каля Палацу спорту), адкуль праваднік завёў усіх «на яўку». У імпрэзе бралі ўдзел «вэтэраны»-пратэстанты: 72-гадовы сьвятар Эрнст Сабіла й 83-гадовы вернік Ўладзімер Канатуш. Абодва пакаштавалі савецкага лягеру.

У.Канатуш трапіў туды ў 1950 г. на пяць гадоў: «Я нават Біблію меў, хоць было забаронена. Мне прыслалі цыбулю, загорнутую ў старонкі зь Бібліі. Я іх сшыў і трымаў каля сябе». Падчас ператрусаў клаў Біблію пад два тамы Дастаеўскага: паглядзяць адну кнігу зьверху, другую, а ніжнюю ўжо і не чапаюць. Калі Біблію забіралі-такі, Канатуш ішоў да начальства й казаў: «Вы ведаеце, што я сяджу за веру, таму аддайце мне Кнігу».

Вярнуўшыся ў Менск, ён змог уладкавацца на працу толькі на будоўлі. Скончыў бухгальтарскія курсы, пачаў працаваць па спэцыяльнасьці. «А потым у газэце быў разгромны артыкул пра нашую граматаду. Мяне выклікаў дырэктар, паклаў паперу, асадку й кажа: «Пішы». — «Што пісаць?» — «Што адракаешся ад веры». — «Не напішу...» У.Канатуш вярнуўся на будоўлю, дзе й працаваў да пэнсіі. На пачатку 90-х яго гісторыяй зацікавіліся журналісты. «Называюць у газэтах легендай. Але ў прамежку між артыкуламі ніхто не цікавіцца, як «легенда» жыве. Мне як незаконна рэпрэсаванаму павінны выдаваць бясплатна лекі, але замест 30 таблетак на 30 дзён я атрымліваю 20 таблетак на тры месяцы», — наракаў У.Канатуш.

Пастар Эрнст Сабіла, вядомы па богаслужэньнях на Дзядах і на мітынгах, быў настроены па-баявому, распавядаў пра змаганьне за веру й за Беларушчыну. Ён таксама прайшоў выпрабаваньне канцлягерамі. Там пазнаёміўся зь беларускімі патрыётамі Цімохам Вострыкавым і Касьцюком, там удзельнічаў у стварэньні падпольнай Прагрэсіўнай партыі Расеі. Двойчы ўцякаў і ня быў паранены пры ўцёках: «Я памаліўся: Божа, калі прыйшоў мой час, дык забяры мяне да сябе, а калі не — дык я пайшоў». Узяў лесьвіцу, падышоў да плоту і палез. Пералез — там вартавы: стой, страляць буду. Палез я цераз другі плот, а лесьвіца падламілася: вісіць на плоце жывая мішэнь, а па ёй вартавы смаліць. Мне потым сказалі: найлепшы стралок дывізіі — ну, у муху мог пацэліць! Пераваліўся — і нэрвы здалі: не пабег я, а пайшоў». Сабілаў сьлед ня здолеў узяць нават сабака: «Па маім сьледзе прайшлі дзеці, якія зьбіралі кедровыя арэхі, яны й зьбілі сабаку з панталыку…»

Гэта не апошняя сустрэча зь вернікамі-дысыдэнтамі. Маладафронтаўцы маркуюць запрашаць праваслаўных, каталікоў, уніятаў — змагароў за веру. Ці азначае гэткі кірунак, што МФ стане маладзёвым аналягам КХП-БНФ? Севярынец адмаўляе такую імавернасьць: «Вядома, для нас вельмі важнае значэньне мае вывучэньне гісторыі беларускай хрысьціянскай дэмакратыі, мы абвясьцілі арыентацыю на хрысьціянскія каштоўнасьці. Але пакуль што «Малады фронт» ня мае намеру ператварацца ў партыю такога кшталту».

**Аркадзь Шанскі**

# Сцэнар для дэмакратычнага ўраду



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Алесь Анціпенка і Агнешка Камароўска падчас прэзэнтацыі**

Працяг са старонкі 1.

Кніга стала таксама спробай падагульніць дзяржаватворчую і рэфармісцкую думку, якая разьвівалася з пачатку 90-х. Тут прааналізаваныя праграмы палітычных партыяў і перадвыбарчыя праграмы кандыдатаў у прэзыдэнты. Праца над стварэньнем тому йшла цягам году. У ёй бралі ўдзел палітолягі Ўладзімер Мацкевіч і Віталь Сіліцкі, былы судзьдзя Канстытуцыйнага суду Міхаіл Пастухоў, эканамісты Ўладзімер Калупаеў і Міхась Залескі ды многія іншыя.

Каардынатарка праекту ад Фонду імя Сьцяпана Батуры спн.Агнешка Камароўска падкрэсьліла, што адна з мэтаў выданьня — ажывіць распрацоўку канцэпцый разьвіцьця і дыялёг пра эўрапейскую будучыню Беларусі, а таксама актывізаваць грамадзкую дыскусію па гэтай тэматыцы. Экспэрты з балтыйскіх краінаў, Польшчы, Славакіі, Украіны, Баўгарыі расказвалі пра досьвед эўрапейскай інтэграцыі і давалі камэнтары да ідэяў беларускіх калегаў. Спадарыня Рута Вайніенэ, віцэ-прэзыдэнтка Літоўскага інстытуту свабоднага рынку, сказала на прэзэнтацыі: «Я падзялілася досьведам літоўскіх рэформаў. Але я ня ведаю, ці прымуць іх беларусы, ці павераць у гэта? Зрабіце хоць адну рэформу з гэтай кнігі — і вы адчуеце, як гэта добра». Тамсама, на прэзэнтацыі, што адбылася ў менскім Міжнародным адукацыйным цэнтры, спн.Рута Вайніенэ пажадала ўсім сустрэцца ў Эўразьвязе.

**Веранiка Дзядок**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

**28 верасьня за ўдзел у несанкцыяваным пікеце ў Віцебску быў затрыманы Зьміцер Сялюк.** Старшыню рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва» **Анатоля Шумчанку** затрымалі 1 кастрычніка, калі ён спрабаваў прайсьці ў Менгаргаспуд. Падчас затрыманьня былі зьбітыя некалькі жанчынаў. Шумчанка бараніў інтарэсы прадпрымальнікаў, якія пратэстуюць супраць зносу шапікаў з вуліцаў Менску. З 1 кастрычніка пачалі галадоўку бабруйчанкі **Любоў Санкевіч** і **Галіна Гусева**. Жанчыны дамагаюцца адначальненьня парушаных правоў: Л.Санкевіч, паводле яе меркаваньня, незаконна звольнілі з працы; Г.Гусеву — абышлі падчас размеркаваньня кватэраў. 17 кастрычніка Г.Гусева выйшла з галадоўкі з прычыны пагаршэньня здароўя. 22 кастрычніка кабеты ладзілі несанкцыяваны пікет на Кастрычніцкай плошчы ў Менску, дамагаючыся сустрэчы з А.Лукашэнкам. Міліцыя затрымала Л.Санкевіч, **Яніну Аўсянік,** карэспандэнта радыё «Свабода» **Валера Каліноўскага**, назіральніка ад БХК **Юр'я Грыгор'ева** і кінарэжысэра **Руслана Зголіча**. Іх пратрымалі ў пастарунку гадзіну й адпусьцілі без складаньня пратаколу. На Дзяды ў Віцебску былі затрыманыя сябры КХП-БНФ **Уладзімер Плешчанка**, **Аляксандар Салаўян**, **Алесь Пазьняк**, **Ян Дзяржаўцаў**, **Алег Емяльянаў**, **Ігар Мацьвееў** і **Тамара Мамчыц** — несьлі па горадзе крыж, каб усталяваць яго ў памяць пра ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў, расстраляных на Ўсьпенскай горцы.

**АШ**

## ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### Як справіўся Сідорскі

**За дзевяць месяцаў урадаваньня Сяргея Сідорскага засталіся нявыкананымі 5 з 16 асноўных прагнозных парамэтраў на 2003 г.,** у тым ліку рост вытворчасьці прадукцыі сельскай гаспадаркі, харчаваньня, павелічэньне рэальных грашовых даходаў насельніцтва. ВУП вырас на 106%, але запасы гатовай прадукцыі на складах дасягнулі 64% аб'ёму месячнае вытворчасьці, болей за трацiну прамысловых прадпрыемстваў застаюцца нерэнтабэльнымі, нягледзячы на дзяржаўную падтрымку і падатковыя льготы. 64% сельгаспрадпрыемстваў — стратныя. Толькі дзякуючы прысядзібным і фэрмэрскім гаспадаркам удалося дабіцца запаволеньня зьніжэньня паказьнікаў у аграрнай галіне. І гэта нягледзячы на 900 млрд руб. сёлетніх дзярждатацыяў.

### Пляны «Белавіі»

**У чэрвені 2004 г. «Белавія» мае набыць яшчэ два «Боінгі».** У 2005-м парк папоўніцца «Эмбраерам-145» бразыльскай вытворчасьці (на 50 месцаў). Ён павінен замяніць «Як-40» і «Ан-24» для палётаў на Стакгольм, Бэрлін і Варшаву. Набудуць яго, відаць, у авіякампаніі «Lot» (Польшча), якая пляе замяняць «Эмбаеры» на больш умяшчальныя. У 2006 г. «Белавія» пляне купіць яшчэ «Боінг» і «Эмбраер».

### Супэрсупэрмаркет

**Новы гарадзенскі супэрмаркет зойме 6 га плошчы, дасьць гораду 7 млн даляраў інвэстыцыяў і 400 новых працоўных месцаў.** Да 1 студзеня 2005 г. ён павінен прыняць першых пакупнікоў. Інвэстуе супэрмаркет прадпрыемства «Гандальоптыма», якое заадно пабудуе ў Горадні дзьве электрычныя трансфарматарныя падстанцыі і пракладзе 450 м каналізацыі.

### «Белнафтахім» манапалізуе рынак

**З 1 лістапада пачало дзейнічаць новае палажэньне аб ліцэнзаваньні гандлю нафтапрадуктамі.** Каб займацца аптовым і розьнічным гандлем нафтапрадуктамі (бэнзын, дызэльнае паліва, мазут, рэактыўнае паліва, асьвятляльная газа, пячное паліва), трэба мець ліцэнзію ад канцэрну «Белнафтахім». Ліцэнзія выдаецца на пяць гадоў, яшчэ на пяць яе можна працягнуць.

**СП, БелаПАН**

# Галадоўка імя дэкрэту №4

Кіроўцы прыватнага «радыётаксі» ў Ваўкавыску скончылі галадоўку ня вымушана, ад беспэрспэктыўнасьці змаганьня, а — дамогшыся задавальненьня ўласных патрабаваньняў. Выпадак беспрэцэдэнтны. Некаторыя пасьпелі пагаладаць няшмат — літаральна два-тры дні, іншыя — тыдзень, частка — два тыдні. А сам уладальнік таксовак Мікалай Аўтуховіч — каля дваццаці дзён.

Нагадаю фабулу. У прадпрымальніка Аўтуховіча арыштавалі трынаццаць аўтамабіляў — у заклад за штраф, прыдуманы падатковай службай. Дзевяць мэрсэдэсаў-таксовак, два мікрааўтобусы-мэрсэдэсы, яшчэ адзін «мікробус», на выкарыстаньне якога для перавозкі пасажыраў улады «пашкадавалі» ліцэнзію, і машына-эвакуатар вельмі калярытна выглядалі на штрафной аўтастаянцы ДАІ за горадам.

Падатковая арыштавала машыны па-чыкагску. Таксоўкі на вуліцы «падразалі» машыны ДАІ, спынялі, забіралі дакумэнты, забаранялі паведаміць дыспэтчэру, куды раптам зьніклі таксоўкі. Міліцыя нават мела пры сабе «калашнікавы». Мэрсэдэсы загналі на загарадную стаянку, а кіроўцаў, забараніўшы забіраць з салёнаў асабістыя рэчы ды грошы, пусьцілі ў горад пешшу — за 4—5 кілямэтраў. «Арывэдэрчы».

Падатковая служба — вельмі важны карны орган гэтай улады. У карных органаў лёгіка адзіная — хапаць мёртвай хваткай. На тое, што кіроўцы таксовак, мэханікі, дыспэтчэры апынуліся бяз працы на няпэўны тэрмін, падаткавікам было цалкам напляваць. Калі пачалася галадоўка, у гэтай службе мне сказалі літаральна так: хай Аўтуховіч ня торгаецца: праверка працягваецца і яму могуць налічыць яшчэ пару мільярдаў, так што ня хопіць ніякай маёмасьці, каб разьлічыцца за штраф.

Такім чынам, тыя 273 млн рублёў штрафу, у заклад за які арыштавалі машыны прадпрымальніка, гэта, паводле меркаваньня падатквікоў, — вялікае дабро для Аўтуховіча. Ён ледзьве ня ўдзячны мусіў быць за гэта.

Сапраўды: 273 мільёны і 4 мільярды — ніякага параўнаньня! Але адкуль узялася першая лічба? Падатковая служба вырашыла, што кіроўцы павінны былі здаваць выручку ў касу фірмы «Ніка-транс», дзе яны стаяць на ўліку, а ня ў касу прадпрымальніка Аўтуховіча, у якога яны працавалі згодна з дамовай. Паколькі за пяць месяцаў працы яны здалі 130 зь нечым мільёнаў, дык, паводле карна-органаўскіх правілаў, штраф павінен быць дакладна ўдвая большым. Гэтак атрымаліся 273 мільёны. Якая ў гэтай краіне геніяльна-простая арытмэтыка зарабляньня грошай!

Так, Аўтуховіч сапраўдны кіт у бізнэсе ня вельмі вялікага Ваўкавыску. Яму асабіста належаць 18 машын «радыётаксі». Але што за недарэчныя зачэпкі? «Ніка-транс» і Аўтуховіч знаходзяцца ў суседніх памяшканьнях. Заснавальніца «Ніка-трансу» — жонка прадпрымальніка. Кіроўцы працуюць у яго паводле дамоўленасьці ня так даўно, да гэтага вымусіў травеньскі 4-ы дэкрэт прэзыдэнта (прадпрымальнік ня можа мець больш за трох наёмных працаўнікоў). Вось дзе закапаны сабака.

Усе дзяржаўныя ўстановы падпарадкоўваюцца карным органам. Галадоўшчыкі патрабуюць вярнуць таксоўкі і даць ім магчымасьць працаваць далей. А ў гэты самы час міністар транспарту Баравы падпісвае загад: прыпыніць ліцэнзію Аўтуховіча на таксаперавозкі з 20 кастрычніка на месяц. Гэткі нож у сьпіну. Мінтранспарту пра таксоўцаў з райцэнтру насамрэч і не ўспаміналa, але паступіла каманда



**Першы кліент «Радыётаксі-22222» атрымаў бутэльку шампанскага.**

зь міністэрства падаткаў і збораў.

Цяпер ужо бяз працы апынуліся 60 чалавек (раней было 35). Аўтуховіч едзе ў Нацбанк, і яму даюць паперу, у якой напісана, што парушэньняў «касавай дысцыпліны» не было: кіроўцы павінны былі здаваць яму выручку. Міністэрства падаткаў і збораў таксама зрабіла ў Нацбанк такі запыт... Праўда, у адказе былі канцылярскія фармулёўкі накшталт «на нашу думку», «парушэньня... у дадзенай сытуацыі не назіраецца». Карацей, галадоўшчыкам адказ надаў аптымізму, але аптымізму асьцярожнага, няўпэўненага.

Аднак пракуратура заявіла пратэст супраць прыпыненьня ліцэнзіі Аўтуховіча. 5 лістапада з раніцы «Радыётаксі-22222», пасьля месячнага перапынку, распачало працу. Першы кліент, які зьвярнуўся па таксоўку, атрымаў у падарунак бутэльку шампанскага.

Перамога ў Ваўкавыску — нечаканае выключэньне. Але, тым жа часам, яно сьведчыць, што сякія-такія шанцы ў беларускіх людзей, калі яны згуртоцца, ёсьць. Карныя органы помсьлівыя. Аўтуховіч яшчэ можа мець зь імі праблемы ў будучыні. Што ж да кіроўцаў, яны — найманая сіла, яны адназначна перамаглі. Хоць кіроўцы рызыкавалі толькі працоўнымі месцамі, Аўтуховіч — маёмасьцю, і немалой. Дарэчы, у ягоным кабінэце вісіць партрэт Аляксандра Рыгоравіча, пад якім галадоўшчыкі часта зьбіраліся, каб абмеркаваць сваё становішча.

**Сяргей Максімовіч**

ДЗЯДЫ

# Курапаты аб’ядналі



**Сёлетнія Дзяды ў Менску паяднялі ўсе нацыянальныя сілы: да прадстаўнікоў КХП-БНФ далучылася Партыя БНФ ды іншыя.**

Нават надвор’е спрыяла гэтай задуме: сьнег сышоў, тэмпэратура набрала плюсавыя градусы. Ля гадзіньнікавага заводу сабралася некалькі соцень чалавек. З палітычных лідэраў былі Зьміцер Бандарэнка, Юрась Беленькі, Вінцук Вячорка, Цімох Дранчук, Андрэй Саньнікаў, Мікола Статкевіч. Павал Севярынец далучыўся крыху пазьней: быў на «сходзе беларускіх патрыётаў» у Курапатах, які адбыўся за паўтары гадзіны да пачатку агульнага шэсьця. Сяргей Высоцкі, які праводзіў гэты сход, на шэсьце не пайшоў: маўляў, мы ўжо ў Курапатах і ўсе прыйдуць сюды да нас. Жалобным шэсьцем прайшлі таксама Мая Кляшторная, Зінаіда Бандарэнка, Генадзь Сагановіч...

На чале калёны несьлі крыжы. На рагу праспэкту насупраць Усходніх могілак прыпыніліся, каб узгадаць Дзяды 1988 г., а потым рушылі па вул.Каліноўскага. З акна аднаго з дамоў шэсьце віталі разгорнутым нацыянальным сьцягам. Такі ж сьцяг разьвінаўся з акна тралейбуса, што праехаў насустрач.

Мітынг у Курапатах ужо другі год адбываецца на горцы — «курапацкай Гальгоце»: каля памятнага крыжа пляцоўку раскурочыла будаўнічая тэхніка ды паступова забалочвае вада з выведзенай да крыжа канавы. Павал Севярынец успамінае першыя Дзяды, на якія ён патрапіў, — у 1995 г. «Тады выступалі і Быкаў, і Пазьняк, а сабралася ўсяго каля 200 чалавек. Я думаў, што гэта канец нацыянальнага руху. Але ж потым была вясна 1996-га!»

Заяўнікамі акцыі выступіла КХП-БНФ, таму мітынг вёў Юрась Беленькі. Зачытвалі пасланьне з Варшавы ад Пазьняка. Зянон пісаў пра беларускую салідарнасьць, памяць продкаў і расейскую пагрозу. Згадвалі падзеі 15-гадовай даўніны і час утварэньня БНФ, прыезд Клінтана ў Курапаты і вахту падчас будаўніцтва кальцавой дарогі. У.Папкоў казаў: пакуль расейскі прэзыдэнт не пакаецца і ня ўкленчыць у Курапатах, на Расеі ня будзе Божае ласкі. Пры канцы мітынгу Ю.Беленькі даў слова А.Трусаву ды В.Вячорку, назваўшы апошняга «кіраўніком палітычнай партыі», але не ўдакладніўшы — якой. Вячорка на дробны ўкол не зважаў, у прамове зазначыў: «Беларусы павінны заўжды яднацца на два дні ў годзе — на 25 сакавіка і на Дзяды».

**Аркадзь Шанскі**

## Габрэйскія могілкі — самыя дарагія

**Сэсія Аршанскага гарсавету вырашыла ўвесьці плату за пашырэньне ўчастку на могілках.** Цяпер для пахаваньня двух нябожчыкаў дарма адводзіцца 2,3х2 мэтры. Такога ж памеру павінна быць і агароджа. Калі ж грамадзяне жадаюць «заняць месца» на ўсю радзіну, за дадатковыя квадратныя мэтры давядзецца плаціць. Сума залежыць ад прэстыжу могілак. Так, у Савішчыне пад Воршай дадатковы квадратны мэтар каштуе ўсяго 49,5 тыс. руб. Праўда, хаваюць там у асноўным бамжоў ды зэкаў, бо могілкі — чыстая балаціна. На астатніх такса вагаецца ад 132 да 165 тыс. руб. Самая высокая цана — 247,5 тыс. — на габрэйскіх могілках. Прычым габрэйская грамада ў Воршы невялікая, дый звычаю абгароджваць пахаваньні ў габрэяў няма. Але ў сувязі з тым, што галоўныя гарадзкія могілкі лічацца зачыненымі, тут пачалі хаваць ня толькі габрэяў. Некалькі гадоў таму на габрэйскіх могілках знайшоў сабе апошні прытулак забіты злодзей у законе. Магіла яго хутка займела вялікую і прыгожую агароджу. Можа, на такіх людзей і разьлічаныя падвышаныя цэны?

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## На апэрацыю — за 78 кілямэтраў

**У круглянскай больніцы плянуецца закрыцьцё хірургічнага й інфэкцыйнага аддзяленьняў, скарачэньне 50 мэдработнікаў.** Калі гэта здарыцца, хворых, што маюць патрэбу ў тэрміновай апэрацыі, будуць адвозіць у магілёўскія больніцы на машынах хуткай дапамогі, якія часам ня маюць паліва для такіх далёкіх паездак.

Галоўны лекар больніцы, які выступае за захаваньне ўстановы, вызвалены ад пасады. На яго месца шукаюць больш «памяркоўнага» спэцыяліста, які дазволіць ня толькі скарациць два аддзяленьні, але й разбурыць яшчэ прыдатны стары будынак больніцы. За апошні год у Круглым зьнесена больш за дзесяць яшчэ моцных старых будынкаў.

**Зінаіда Мілешчанка, Круглае**

## Падрабляюць «чарніла»

**Ваколіцы Баранавіч нагадваюць Чыкага пачатку XX ст.** У навакольных вёсках разьліваюць гарэлку й лепяць наклейкі Берасьцейскай гарэльні. Падрабляюць і пладовае віно. У краме «Кастрама» міліцыянты знайшлі больш за 200 пляшак «чарніла» без акцызаў. Прадавачка сама разьлівала тую брыду ў паўтарачныя бутэлькі й пацішу прадавала мясцовым п’янтосам.

**Равяка Руслан, Баранавічы**

# На раздарожжы

На агульнанацыянальных выбарах людзі рэалізуюць сваё права на ўдзел у вырашэньні стратэгічных пытаньняў разьвіцьця краіны. Існая ж мажарытарная сыстэма прымушае кандыдатаў акцэнтаваць увагу на балючых мясцовых праблемах. Так і атрымліваецца, што найважнейшыя пытаньні абароны сувэрэнітэту і выбару кірункаў сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця прыватызуюцца адной асобаю, якая хай сабе і займае найвышэйшую пасаду.

Даўно над намі вісіць дамоклаў меч інтэграцыі, за канчатковую мэту якой беларусы ніколі не галасавалі, нават ня мелі магчымасьці азнаёміцца зь яе ясною фармулёўкаю. Мы сталі закладнікамі хітрых камбінацыяў А.Лукашэнкі і вагаемся ад пэрспэктывы ўваходжаньня ў склад РФ «шасьцю губэрнямі» да шчыльнага саюзу сувэрэнных дзяржаў з адзінаю валютаю. Што азначае першы варыянт, нам вядома з досьведу існаваньня ў СССР. Другі варыянт ілюструе прыклад Пуэрта-Рыка — невялікай дзяржавы, якая «добраахвотна» далучылася да ЗША. У ёй дзейнічае заканадаўства ЗША, ходзіць даляр і існуюць дзьве дзяржаўныя мовы. Выканаўчую ўладу ўзначальвае губэрнатар. Мо якраз апошняя акалічнасьць замінае Лукашэнку ператварыць Беларусь у «добраахвотна далучаную» дзяржаву.

Няпэўнасьць інтэграцыйнай сытуацыі адлюстроўваюць сацыялягічныя апытаньні. Паводле НІСЭПД, колькасьць прыхільнікаў аб'яднаньня Беларусі і Расеі ў адзіную дзяржаву за паўгоду скарацілася з 25,6% да 18,5%. А колькасьць тых, хто падтрымлівае інтэграцыю пры захаваньні незалежнасьці, павялічылася з 67,3% да 76,3%.

Аб'ектыўнай прычынай для росту незалежніцкіх настрояў можа быць толькі нізкая ацэнка беларусамі якасьці жыцьця ў Расеі. На пытаньне «Дзе жывецца лепей?» 36,8% рэспандэнтаў адказалі «ў Расеі», 29,1% — «у Беларусі» і 28,5% адказалі «аднолькава». Аднак гэтая ацэнка якасная. Яна грунтуецца выключна на ўласным досьведзе ды інфармацыі, якую падае маскоўскае тэлебачаньне.

За апошні год колькасьць прыхільнікаў адзінай дзяржавы сярод сымпатызантаў А.Р. скарацілася ў 1,6 разу (з 38,3 да 23,3%)! Істотна павялічылася сярод іх і колькасьць тых, хто будзе галасаваць супраць Канстытуцыі саюзнай дзяржавы, — з 9% у сьнежні 2002 г. да 24,2% у верасьні 2003 г. Відавочна, што гэтыя перамены тлумачацца паводзінамі Лукашэнкі, паколькі перамены настрояў у яго працоўнікаў сацыёлягі не назіраюць.

Блізкая сытуацыя і па пытаньні «пуэртарыканскай» пэрспэктывы Беларусі. Як за, так і супраць увядзеньня расейскага рубля выступаюць прыкладна па 40%. Што сярод прыхільнікаў, што сярод працўнікаў Лукашэнкі. Ізноў славутая раздвоенасьць сьвядомасьці «сярэдняга» беларуса, сапраўдным выразьнікам якой зьяўляецца ППРБ.

Сацыёлягі НІСЭПД наважыліся ўнесьці ў гэтую праблему яснасьць, запытаўшыся ў рэспандэнтаў: «Калі б сёньня праходзіў рэфэрэндум па выбары будучага разьвіцьця Беларусі, як бы Вы прагаласавалі?» І атрымалі адказ:

| | |
|---|---|
| За аб'яднаньне з РФ | 37,9% |
| За ўваходжаньне ў ЭЗ | 23,4% |
| І за адно, і за другое | 23,2% |
| Супраць і аднаго, і другога | 6,5% |

Праўда, у параўнаньні зь веснавым апытаньнем колькасьць «юніяністаў» скарацілася ў 1,5 разу — з 33,6% да 23,2%. Але яснасьці гэта не дадало, бо ў выпадку жорстка сфармуляванага пытаньня «Вы за аб'яднаньне з Расеяй ці за ўваход у Эўразьвяз?» адказы былі наступныя: за Расею — 47,6%, за ЭЗ — 36,1%.

А цяпер параўнаем гэтыя лічбы з вынікамі апытаньня прыхільнікаў «расейскага» шляху Беларусі. За адзіную дзяржаву з Расеяй — 18,5%. За аб'яднаньне з Расеяй, калі альтэрнатывай Эўразьвяз, — 47,6%. Калі большы выбар, за аб'яднаньне 37,9%. Пра штo гэта гаворыць, як не пра гранічную разгубленасьць і блытаніну ў галовах? Магчыма, што сацыялёгія тут ні пры чым. Асьцярожны беларус проста адмаўляецца рабіць рашучы выбар пры адсутнасьці вычарпальнай інфармацыі.

У палітычным пляне гэтая сумная сытуацыя азначае, што нашае грамадзтва расколатае ў пытаньні выбару стратэгічнага кірунку разьвіцьця краіны. Існы беларускі рэжым не стварыў нармальных умоваў для ўсебаковага абмеркаваньня наступстваў нашага руху на Захад ці на Ўсход. Пакуль у грамадзкай сьвядомасьці выйграе прарасейская эліта, хоць доказаў на карысьць яднаньня зь беднай і праблемнай Расеяй менш, чым за далучэньне да дэмакратычнага, багатага і свабоднага Эўразьвязу. Выбарчыя кампаніі, якія набліжаюцца, даюць магчымасьць узмацніць праэўрапейскую прапаганду.

У краінах, якія імкнуцца ад таталітарызму да дэмакратыі, выкарыстоўваецца прапарцыйная выбарчая сыстэма. Яна дазваляе любой значнай частцы грамадзтва мець сваё прадстаўніцтва ў парлямэнце. Яна абмяжоўвае магчымасьці выкарыстаньня «адміністрацыйнага рэсурсу». Нарэшце, прапарцыйная сыстэма здымае праблему недаінфармаванасьці пры вырашэньні любога пытаньня і спрыяе дасягненьню згоды ў грамадзтве. Беларусь ня стане дэмакратычнай краінай, пакуль будзе выкарыстоўвацца мажарытарная выбарчая сыстэма.

Нават у традыцыяналісцкай Вялікай Брытаніі, дзе мажарытарная сыстэма адточвалася стагодзьдзямі, пляную ць адмовіцца ад яе ў Паўночнай Ірляндыі. Там грамадзтва жорстка распадаецца на дзьве грамады — пратэстантаў і каталікоў. Паколькі пратэстантаў болей, яны апаноўваюць усе кіроўныя пасады. Гэта вядзе да няспыннага ўнутранага канфлікту. Прыкладна тое ж назіраецца ў Беларусі.

Усё-такі добрая навука сацыялёгія!

**Юры Хадыка,**
намесьнік старшыні партыі БНФ

Пуэрта-Рыка — невялікая дзяржава, якая «добраахвотна» далучылася да ЗША. Выканаўчую ўладу ў ёй узначальвае губэрнатар. Мо якраз апошняя акалічнасьць замінае Лукашэнку ператварыць Беларусь у «добраахвотна далучаную» дзяржаву.

# У Бегамлі невясёла

**На мінулыя выходныя езьдзіў у Бегамле да маці.** Бульба ўжо даўна дакапаная, але на вёсцы праца ёсьць заўжды. Нешта дапамог, а ўвечары, як заўсёды, сядзелі і размаўлялі за сталом, расказвалі адно аднаму навіны. Так сталася за апошні час, што амаль усе падзеі на вёсцы нейкія адмоўныя.

— Наркаманкі павалтузілі бабу Кацярыну, парвалі кофту, забралі грошы і бутэльку, якія яна несла Івану, каб разьлічыцца за каня, — распавядае маці.

Перапруся, раскажу, адкуль узяліся наркаманы ў гэтых мясьцінах, бо раней тубыльцы чулі пра тых нарыкаў толькі з тэлевізара. Цяпер жа зьявілася мода на іх перавыхоўваньне. І вось нейкія маладыя людзі купілі хату, зрабілі рамонт у ёй і на прысядзібнай дзялянцы. Замежныя фундатары толькі цмокалі языкамі. Справа патрэбная, няма ніякіх спрэчак, але, але... Няўжо ў Беларусі мала сваіх наркаманаў? А тут пачалі прывозіць іх на перавыхаваньне з Расеі,аднекуль з-пад Піцеру. Мо нейкая новая саюзная праграма, кшталту «саюзнага тэлевізара» ці «саюзнага рухавіка»?

— Як гэта? — пытаюся. — А ў міліцыю баба Кацярына зьвярталася?

— Не, так вырашылі пытаньне. Старэйшы гэтых наркаманаў прабачыўся і грошы вярнуў. Смаркачак тых выправілі дамоў, а на іх месца прывезлі новых. Вось толькі пра бутэльку баба Кацярына не сказала.

Добрыя ў нас людзі. Старую зьбілі, зьняважылі, а яна іх галоўнаму пра бутэльку не сказала, «а то ж маглі дзяцей і пакараць».

— Маці, а што добрага было за апошні час?

— Грыбы ў нарыхтоўшчыкаў падаражэлі, лісіцы бяруць цяпер па дванаццаць тысяч за кілё, а я ведаю колькі добрых мясьцін. Цяжка, але лес пракорміць.

...Час нібы спыніўся. Як і колькі ўжо пакаленьняў, усё добрае зьвязана ў сялян толькі з зямлёй-карміцелькай і лесам, а іншага за працай і не разгледзіш.

**Wint, Менск**

# Нашчадкі Шарантону

**Шмат гавораць пра Эўрапейскую Канстытуцыю.** То зьмяняюць сыстэму галасаваньня, то пазбаўляюць маленькія краіны вагі, то з Канстытуцыі выключаюць радок пра хрысьціянскія каштоўнасьці — пра ўсё гэта спрачаюцца.

Але ёсьць адзін момант, пра які ўсе звычайна маўчаць. Ёсьць патаемная й сарамлівая цемра, схаваныя падваліны й скляпеньні Эўрапейскага Дому, якія лепей не паказваць анікому, нат самому сабе. У 1814 г. памірае чалавек, якога можна назваць першым тэарэтыкам аб'яднанай Эўропы.

Данасьен Альфонс Франсуа дэ Сад, які сканаў у вар'ятні Шарантон, ніколі не лічыўся фігураю прэзэнтабэльнай. Ягонае жыцьцё й асабліва ягоныя творы заўжды выклікалі шок. І хоць сёньня гэты шок аслабляецца, фігуру маркіза дасюль хаваюць у цені. Але ці ня ёсьць ягоныя заклікі прыкласьці «крыху высілкаў, каб зрабіцца рэспубліканцамі», і, галоўнае, — ягоны інтэгральны атэізм цёмным падмуркам Эўрапейскага Дому? Ці не зьяўляюцца эўрапейцы нашчадкамі Шарантону?

Сьвет дэ Сада — гэта простыя эўрапейскія інстытуты, інстанцыі, жорсткія і празрыстыя правілы на тэатральным эшафоце; гэта ўсеагульная бюракратыя з нататнікамі жаданьняў. Усё празьмернае, усё празрыстае — і ўсё прапісанае.

Вы лічыце, што апошні фільм Пазаліні паводле маркіза дэ Сада «Сало, альбо 120 дзён Садому» зь невыносьнымі мярзотамі катаваньняў — гэта пра фашыстоўскую «рэспубліку» Сало? Анічога падобнага. Гэта пра дэмакратычную Італію, што сёньня старшынюе ў Эўразьвязе. «Наша Італія — фашыстоўскі дэмахрысьціянскі закуток», — гаварыў калісьці дысыдэнт Пазаліні. Падобны закуток можна намалёўваць пярам дэ Сада.

А што ж Усходняя Эўропа, ці, як кажуць цяпер, Эўропа Цэнтральная, Сярэдняя?

Калі Заходняя Эўропа — прыхаваныя інстытуты садызму, то Усходняя — узьдзі й практыка мазахізму. Быў такі галіцыйскі пісьменьнік — Леапольд Захер-Мазох. Ягоныя творы, што занудна сьцю не саступаюць творам незабыўнага маркіза, распавядаюць пра містычныя псэўданародныя рытуалы, што даводзяць да сьмерці, пра навязьлівых вучняў, якія ўпарта шукаюць зафутраваных і халодных выхавальніц, здольных прасьвятліць і, галоўнае, пакараць недарэкаў. Сьлёзы й мяккасьць завяршаюцца жорсткасьцю і чаканьнем.

Можна, вядома, раскрыць рот і чакаць чарговых бюракратэсаў з Выраю: «Ах, мадамачка з Асамблеі, вазьмеце бізунчык у ручкі белыя... Мы такія дрэнныя... праўда... такія гадкія... асабліва вось гэтыя... Што, не жадаеце? Зусім?»

Не жадаюць.

Спачатку вымыцца трэба, падстрыгчыся — а потым і выхаваньне пачнецца. Істытутамі, правіламі, інстанцыямі, параграфамі ў чорных сшытках. Там і Эўраканстытуцыя наверне цца — і хто сказаў, што Канстытуцыя гэта дрэнна?

Але ў скляпеньнях Эўразьвязу заўжды будуць блукаць цені памерлага ў Шарантоне маркіза і ягонага тавараша ва ўзгадваньні Леапольда.

**Андрэй Расінскі**

# З Барысава

Пасьля нейкага няўдала праведзенага матчу «БАТЭ» расчараваны заўзятар кінуў фразу: «Яшчэ адна такая гульня, і я на стадыён ні нагой». Дзіўна было б пачуць такія словы ад якога італьянскага тыфозі. Там, на Захадзе, наадварот, прынята падтрымліваць каманды ў складаныя пэрыяды. У нас — не. Можа, гэта яшчэ адна з прычынаў нашага неэўразьвязаўскага становішча.

* * *

Сьледам за вераб'ямі з барысаўскіх вуліцаў паволі зьнікаюць галубы. Можа, таму, што птушка міру недарэчна выглядае ў горадзе вайскоўцаў.

* * *

Пэрсанал бальніцы на суботніку прымушаюць стрыгчы нажніцамі газон. Абсурд казак Керала знайшоў сабе паўнавартаснае месца ў мазгох кіраўнікоў сёньняшняга Барысава.

**Зьміцер Панкавец, Кастрыца**

# Мабільнікі для глухіх

**Гаворка пойдзе не пра нейкія адмысловыя мабільныя тэлефоны.** Спэцыялізаваных мабільнікаў для інвалідаў па слыху не існуе. І глухія самыя звычайныя: людзі, што акаляюць нас паўсюль — у транспарце, вулічным натоўпе, кавярнях. Паводле дадзеных Беларускага таварыства глухіх, усяго іх у краіне налічваецца больш за дзесяць тысячаў, у Менску — каля дзьвюх з паловай.

Нярэдка можна пабачыць кампанію маладзёнаў, што стасуюцца на мігі, з мабільнікамі на шыях. Знаёмая распавяла, як яна з братам — інвалідам па слыху — ехала ў электрычцы. Усю дарогу «балбаталі», трымаючы на каленях свае тэлефоны. На суседняй лаве кабета запытала ў суседкі: «А на халеру глухім мабільнікі?» Тая пачала тлумачыць пра SMS-паслугу — магчымасьць дасылаць тэкставыя паведамленьні з мабілы на мабілу. Можна ўявіць зьдзіўленьне абедзьвюх кабет, калі знаёмай патэлефанавалі і яна раптам пачала адказваць «па-чалавечаму».

Зьяўленьне мабільнікаў значна спрасьціла жыцьцё інвалідам па слыху. У адсоткавых адносінах глухія зьяўляюцца значна большымі спажыўцамі мабільнай сувязі, чымся тыя, хто чуе.

Усе сябры таго знаёмага глухога маюць дарагія «накручаныя» апараты, з каляровымі экранамі і г.д. Свайго роду спабоніцтва, імкненьне быць «ня горшым»... Лаўлю сябе на ўсё той жа непадуладна-цынічнай думцы: «А на халеру?»

**Анатоль Івашчанка, Менск**

# Народзіны Палітэху!

**17 кастрычніка Менскі дзяржаўны політэхнічны каледж адзначыў 75-годзьдзе.** У 1928 г. ён быў заснаваны як Чырвоны тэхнікум і пачаў рыхтаваць тэхнікаў-гідролягаў для народнай гаспадаркі. Пасьля вайны яму надалі статус палітэхнікуму, а з 2000 г. палітэх называецца Менскім дзяржаўным політэхнічным каледжам. Там рыхтуюць спэцыялістаў у асноўных гаспадарчых спэцыяльнасьцях: мікраэлектроніка, тэхналёгія машынабудаваньня, мэтралёгія і стандартызацыя, дакумэнтальнае забесьпячэньне кіраваньня.

Я спадзяюся, што Палітэх і надалей будзе прыносіць вялікую карысьць незалежнай Беларусі і яшчэ ня раз зьбярэ грамаду на свой юбілей.

**Барыс Гарэцкі, Менск**

Таццяна Сьнітко

# На ПМЖ у Юзуфове

## Нататкі экс-гараджанкі

Штовечару, як сьцямнее, бачу жаўтаватае зарыва на частцы неба. Гэта ня сонца заходзіць, гэта сьвятло Менску. Часам востра адчуваецца: там, за даляглядам, засталося пятнаццаць гадоў жыцьця. Вельмі многа, амаль палова.

Я магла б доўга распавядаць, як люблю Менск. Чаму ня вельмі любіла яго ў 88-м і чаму мы сталі адной крыві ажно ў 96-м. Той, хто нарадзіўся за сотню кілямэтраў адсюль і за школьныя гады ўсяго раз быў на вёсцы ўзімку, а ў горадзе — улетку; хто ў Менску бываў пару разоў за дзяцінства, дый тое на вакзале, у цырку й Курасоўшчыне, — таму, напэўна, і так усё ясна.

Апошнімі гадамі многія нашы сябры пакінулі Менск, зьехалі на Захад. Іхнія дзеці ўжо засвоілі хто нямецкую мову, хто ангельскую. Нашыя ж удасканальваюць беларускую. Яшчэ перад выбарамі 2001-га я асьцярожна высьвятляла, як мае муж з дачкой успрынялі б адʼезд у замежжа. Абое катэгарычна адмаўляліся паўгоду запар. Сын-немаўля вымушана ўстрымаўся ў галасаваньні, і я засталася ў меншасьці. Перамог дэмакратычны цэнтралізм. І мы зьехалі на іншае ПМЖ. Так я трапіла ў вёску зімовую другі раз. Знаёмыя жахаліся, асабліва карэнныя менчукі, але... Чорт стаўся не такім страшным!

Не сумую па сьветлым далягглядзе. Там засталіся гады абшчаг і чужых куткоў. Усё ж мая душа ня ў Менску, а я ніколі не была мянчанкаю. Менск — родны горад маёй 12-гадовай дачкі. Для мяне — месца працы ды тусоўкі.

### Мястэчка імя чараўніцы

Жыла каля рэчкі Чарняўкі чараўніца. Звалі яе Юзуфа. Добрая яна была. Аднак аднойчы невядома што здарылася, але толькі моцна пакрыўдзіў гэту спадарыню нейкі спадар. І разълавалася Юзуфа на ўвесь род мужчынскі. Ды пракляла ўсіх мужчын, якія жывуць вакол яе хаты. Ці многа, ці мала часу прайшло, але праклён чараўніцы забыўся. А вёску, што вырасла каля таго месца, цяпер людзі называюць хто Юзýфава, а большасьць, нібы на польскі манер, — Юзуфова.

Гэткае паданьне распавядаюць нам — усім і кожнаму паасобку — пра мястэчка, дзе мы цяпер жывём. Распавядаюць розныя людзі, але толькі не бабулі (яны амаль усе чамусьці прыежджыя), а падлеткі і 30-гадовыя. Калі ўвесну памёр 40-гадовы сваяк суседзяў, яны таксама згадалі паданьне. Бо сваякова хата якраз побач зь месцам, дзе быццам бы жыла вядзьмарка. «Як паставілі на скрыжаваньні крыж і асьвяцілі з бацюшкам, дык за некалькі гадоў памерлі вакол яго, у цэнтры, ужо чатыры мужыкі, усе ад трыццаці да сарака», — дадае суседка і просіць валярʼянкі.

Пасьля пахаваньня народ доўга шэпчацца, што Юзуфа пракляла мужыкоў, бо пʼюць. Што ж, калі так, то тая кабета, мабыць, мусіла ўсё жыцьцё вандраваць вакол сьвету. Бо пʼюць і на вёсцы, і ў горадзе, і на поўдні, і на поўначы. Добра, што ня ўсе.

### Зона адпачынку для беларуса

Амаль штодня аўтобус вязе мяне да прыпынку «Вяча». Улетку шторазу сустракаліся тут натоўпы менчукоў, якія прагнулі адпачыць ад гарачага асфальту. Для нас Вяча — штодзённы побыт: у адваротны бок ад вадасховішча рухаешся, пешкі ці машынай, вуліцай Вішнёўкі, каб забраць з садка малодшае дзіця. Вішнёўка робіць уражаньне вёскі для багатых, тут амаль адны прыгожыя катэджы. Але яшчэ прыямнейшае ўражаньне ад дзіцячага садка. Усе супрацоўнікі тут вітаюцца, а часьцяком і гутараць па-беларуску. Хоць афіцыйна садок ня меў і ня мае беларускамоўнага статусу. Загадчыца распавяла, што на родную мову была ўжо пераведзеная ўся дакумэнтацыя, плянаваўся садок выключна беларускі, але нечакана ўмяшалася дзяржаўнае дзьвюхмоўе. Тое, што родная мова тут жывая, — ня проста ініцыятыва «зьнізу», а натуральны лад жыцьця гэтых людзей. Аддаючы сына ў садок, я арыентавалася на максымальную блізкасьць да дому і таму адразу адмовілася ад паездак з малым у Менск. У Юзуфаве ж садок даўно зачынены, будынак пустуе, пляцоўкі для шпацыраў у занападзе. Вёска мела статус мястэчка, пакуль не разваліўся калгас. З часам тут зачынілі сталоўку, цырульню, грамадзкую лазьню, а ў будынку былой калгаснай управы зрабілі пяць кватэраў. Тым ня менш, у вёсцы засталіся пошта, дзьве крамы, бібліятэка, пральня, дом культуры і вялікая, адна з найлепшых у Менскім раёне, школа. На адным зь пяці аўтобусных прыпынкаў ёсьць яшчэ шапік з рознымі «сьнікерсамі», півам і марозівам. Днямі зьявіўся яшчэ адзін — гэта ў Менску іх зачыняюць. Спачатку мяне зьдзіўляла, што частку гаспадарчых тавараў можна набыць і на пошце. Па вёсках цяпер такое — ня рэдкасьць.

Вакол вёскі мноства лецішчаў. Яны — з усіх бакоў. У аўтобусе вяскоўцы і дачнікі дзеляцца мэтадамі вырошчваньня бульбы і ўражаньнямі ад збору грыбоў. Я зьбіраю грыбы ля Вячы па дарозе ў садок альбо ідучы ў паліклініку праз лес. Прайшла з паўкілямэтра — мех груздоў, апенек і трохі белых з асавякамі.

У сьпякотную летнюю пару мы зь дзецьмі добра пачуваліся ў цяністым садзе і пладавітым маліньніку, робячы зь ягоных ягад самаробныя ёгурты і ставячы іх у лядоўню. Госьці былі ў захапленьні. Мы выбіраліся зь межаў «фазэнды» дзеля купаньня ў возеры, рэчцы Чарняўцы ці сажалцы нашых вясковых сяброў. Жаданыя для жыхара сталіцы Вяча й Менскае мора — гэта адпаведна пяць і дванаццаць кілямэтраў ды шмат народу на пляжы. І набыць піва там можна толькі ў адным месцы — каля кавярні «Ўзьбярэжжа», і яно цёплае там, і лядоўня зь цёртай малінай далёка... Лянота ехаць!

Калі ж хочацца культурнага адпачынку, можна аўтобусам ці аўто звазіць гасьцей у Радашкавічы (15 км) і паказаць, скажам, камень на плошчы. З надпісам, што тут жыў слынны беларускі дзяяч Ядвігін Ш. Госьці памруць ад захапленьня ўжо ад адных краявідаў. Альбо паехаць у іншы бок, на Лысую гару, на мяжу Лагойшчыны. Гара гэта другая па вышыні ў Беларусі, да таго ж — легендарная. Калі чараўніца Юзуфа была насамрэч, ці не на Лысую гару прыбывала яна на шабаш, зрабіўшыся чорнаю вядзьмаркаю?

Сузіраючы ўжо паўгоду ўсе гэтыя вадасховішчы, лецішчы, слынныя мясьціны вакол Менску, не магу адчапіцца ад аднае думкі. Калі б Беларусь была свабоднай, эўрапейскай, якое поле дзейнасьці адкрылася б тут! Колькі новых гатэляў, музэяў, кавярняў, экскурсійных маршрутаў, атракцыёнаў для турыстаў даўно зрабілі б тут гішпанцы ці немцы! Як і паблізу Вызны на маёй Салігоршчыне, тут мноства закінутых дзотаў, здаецца, рэшткі «лініі Сталіна», узьведзеная ў 30-я. Дык нават з таго дзоту атрымаўся б міні-музэй. Скажам, Чырвонай арміі, другой сусьветнай ці папросту на тэму вайсковых дзеяньняў на Беларусі. А калі там прадаваць якоенебудзь печыва «Партызанскае» і каньяк



«Зьнішчальнік», а бармэнаў апрануць у камуфляжы з маскхалатамі? У Расеі ды ва Ўкраіне цяпер модна рабіць бізнэс на савецкай (і ня толькі) гісторыі, да нас жа гэткія павевы дойдуць, відаць, няхутка.

## Гены

Мой бацька любіць наракаць, што ён некалі зьехаў у горад зь вёскі, а ягоныя дзеці ўсе рванулі ў адваротным кірунку. Мы жывём у сваіх кватэрах, катэджах і хатах паабапал сталіцы. У прыгарад зьехаў і той, хто мог без праблем займець сваё жытло ў Менску. Цалкам магчыма, што гэта проста гены. Усе нашыя продкі былі рознай ступені заможнасьці землеўласьнікамі. Іхнія імёны-прозьвішчы носяць цяпер мястэчкі, вёскі, лясныя ўрочышчы Меншчыны. Самы вядомы «цёзка» продкаў — рынак Ждановічы. Гэта маё дзявочае прозьвішча ў множным ліку.

Акінуўшы вокам «ураджайныя соткі» ў паўгектара, што выпадкова зваліліся на нас разам з вырашэньнем жыльлёвага пытаньня, я спачатку разгубілася. Праз хвіліну захацелася абнесьці ўсё платамі, выкапаць сажалку, пасадзіць вербы, а за маліньнікам адчыніць кавярню. Вар'яцтва. Мець кавярню я хацела яшчэ на другім курсе, чым сьмяшыла суседку-паляшучку Леначку Кулеш. Сьмяшу й цяпер.

## Людзі

Псыхалёгія людзей, сустрэтых у прысталічных вёсках, часам здольная моцна зьдзівіць гарадзкога чалавека. Кожны юзуфовец ведае Менск, як свой падворак. Але 90% менчукоў ніколі ня чулі назваў па-за кальцавой дарогай. Паперня ці Лускава — для іх Марс і Юпітэр. Не бліжэй!

Адна суседзкая бабця (шэсьцьдзесят гадоў зь сямідзесяці жыла ў буйным горадзе) з заўжды нафарбаванымі вачыма месяцамі скардзіцца на бардак у хаце: ёй няма калі прыбіраць за гэтымі градамі. Няўжо, калі мыць падлогу і засьцілаць ложак, на градах нічога ня вырасьце?

Часам дзьвюх старых суседак даводзілася слухаць ледзь не гадзінамі — я не рашалася няветліва іх перапыніць. Цётухны скардзіліся адна на адну. Гэтая багатая, а ў той ня першы мужык — вось і ўсе «грахі».

У адрозьненьне ад старых бабуль, моладзь мае абсалютна нармальнае, напэўна, універсальнае і для вёскі, і для гораду сьветаўспрыманьне. Моладзь ня лаецца і ня дзівіцца, што месца буракоў з цыбуляй у нас занялі ружы зь вяргінямі — хто мае пры хаце кветкі, сам, бяз просьбаў, прыходзіць падзяліцца. Моладзь не разумее, «на халеры сядзець усё лета на гародзе, калі на Ждановічах усё таннае, лепш часам добра адпачыць». У параўнаньні з пакаленьнем бацькоў гэта рэвалюцыя.

З экалягічным мысьленьнем у маладых усё ў парадку, пра палітычнае ж мы спачатку нічога ня ведаем... Пакуль нас не запрашаюць адзначыць Купальле. Вядома, ёсьць і вогнішча, і пошукі папараць-кветкі (яе знаходзіць у садзе дачка гаспадароў), і песьні-танцы, і выпіўка-закуска. Суседзкі сад, дзе мы сядзім, пры шашы — паўз нас ажно тройчы праносяцца пажарныя машыны! Штоthe разу ўсе міжволі азіраюцца на нашае сьціплае вогнішча... «А ўсё-такі ніхто ня здолеў зьнішчыць душу беларуса! — кажа нечакана адна маладая жанчына. — Колькі гадоў забаранялі, а мы вось сядзім, адзначаем нашае, беларускае сьвята. І трасцу ім — будзем заўжды адзначаць!» Я п'ю чырвонае віно за «Жыве Беларусь!» і аказваюся не адзінай.

Мне падабаецца цяга вясковай моладзі — не, ня ў горад! — да гарадзкіх выгод на сваёй зямлі, пэўнага індывідуалізму. Многія тутэйшыя новыя сябры ў сваіх звычайных хатах робяць водаправоды, каналізацыі, каміны ў гасьцёўнях. Альбо плянуюць зрабіць гэта ў хуткай будучыні, паступова: багатых сярод нас няма, хоць няма й галадранцаў. Суседзкай сям'і, Сьветцы й Кольку Вярбіцкім, сельсавет прапанаваў кватэру з усімі выгодамі — у адной з двухпавярховых «хрушчовак», квартал якіх, каб не хлеўчукі з курамі-сьвіньнямі ў двары, нагадаў бы мне самыя старыя вулачкі роднага Салігорску. «На чарта нам гэтая абшчага!» — усклікнула жвавая Сьветка, і ўсе адразу пагадзіліся. Сьветчыны браты жывуць у гарадах — адзін у Менску, другі ў Расеі.

Зьдзівіла мяне і Валянціна Міхайлаўна. Спазьніўшыся на аўтобус, я лавіла спадарожныя машыны. Спынілася нейкая прыгожая іншамарка. Кабеты ў ёй, маладая і старэйшая, вельмі рухавая, выявіліся... мянчанкамі-фэрмэркамі. У вёсцы побач з нашай на пачатку году завялі сваю гаспадарку, гадуюць цяляты. Раней старэйшая (спадарыня Валянціна) выкладала ў ВНУ. Здаецца, паліталёгію. Адкрыта і вельмі пісьменна яна раптам расклала па палічках, што ня так у палітыцы і эканоміцы з прычыны прэзыдэнта. Спн.Валянціна імгненна разумее матывацыю нашага пераезду на вёску і прычыны жаху з гэтай нагоды многіх менскіх знаёмых.

«А вы не падзяляйце іхняга жаху! Рабеце свае справы!» І я адчула, што гэта адносіцца і да іх з кампаньёнкай.

Гэта нагадала мне палкоўніка Алкаева ў часы, калі той яшчэ ня быў палітуцекачом. У 97-м, калі ў даручанай яму ўстанове сядзелі ўкраінскія нацыяналісты, ён сказаў перад чарговым «Чарнобыльскім шляхам»: «Я таксама добра хапіў радыяцыі — не ў Чарнобылі, дык у Сяміпалацінску. Нічога вы ня зьменіце гэтымі «шляхамі». Сядзелі б гэтыя хлопцы ня тут, а дома, гадавалі кабанчыка... Больш карысьці было б». Потым гэты чалавек заўжды цікавіўся лёсам украінцаў, асабліва нашчадкам графа Шаптыцкага. Даведаўшыся, што той сышоў з палітыкі, Алкаеў загадкава ўздыхнуў...

## Ёсьць дзе акапацца

Калі гісторык Ігар Кузьняцоў бараніў у судзе гонар ды годнасьць, адна пэнсіянэрка з групы падтрымкі камуністаў-дагматыкаў назвала мяне ў перапынку «кулацкім недабіткам». Гэта сапраўды камплімэнт для гонару й годнасьці, калі лясы і хутары — твае браты. Па сваяцкіх прозьвішчах.

Я жыву ў Менскім раёне, бо люблю Менск. Але я, здаецца, пачынаю любіць і гэты маладэчанскі — супрацьлеглы ад родных мясьцінаў

> Моладзь не разумее, «на халеры сядзець усё лета на гародзе, калі на Ждановічах усё таннае, лепш часам добра адпачыць». У параўнаньні з пакаленьнем бацькоў гэта рэвалюцыя.

— напрамак. Тое, што мы аселі менавіта тут, — выпадак. Але менавіта ў гэтым выпадку дзіўна сканцэнтраваліся дробязі жыцьця, якія маюць сэнс і ажыўляюць памяць.

Скажам, сярод чачэнцаў я ведала аднаго на імя Юсуп. 17-гадовы кантрабандыст адважна вазіў ежу, лекі, зброю партызанам на такім самым КаМАЗе, якія выкарыстоўваюць чачэнскія сьмяротнікі. І назва вёскі, як бы ні прамаўляў яе люд, застаецца з мусульманскім (верагодна, татарскім) коранем. Гэта напамін пра пэрыяд майго жыцьця, які ўжо скончыўся.

За Радашкавічамі жыў некалі бабчын брат, дзед Стась — адзін з двух маіх дзядоў, асуджаных «польскіх шпіёнаў». У 30-я дзяды хадзілі праз савецка-польскую мяжу адзін да аднаго ў госьці. Бабця зь дзедам і пазнаёміліся на кірмашы недзе каля Нясьвіжу, хоць яна жыла ў савецкай Вызьне, а ён — пад польскімі тады Баранавічамі. Нехта данёс на бабчыных братоў з зайдрасьці. Зь лягераў вянуўся толькі Станіслаў, бо другі брат быў забіты яшчэ ў часе сьледзтва. Сын дзеда Стася стаў паважаным чалавекам, нават узначальваў нейкі завод у Маладэчне, кажуць нашыя сваякі. Я пра гэта мала што ведаю. Але напрамак правільны: недалёка Радашкавічы. І якія яны падобныя на Вызну!

Старыя шпалеры гараць у печы сінім агеньчыкам. Старыя часы і нечыя лёсы-гісторыі гараць разам з шпалерамі. У нас пэрманэнтны рамонт. Гісторыя мусіць распачацца наноў. І зноў напаміны, цалкам выпадковыя. «Грозны» — на старых, раскіданых у буфэце кухні, капэртах. Вядома, я ведаю гэты квартал, нас часталі там гарбатай. Бацька былых гаспадароў — расеец родам з Грознага... Ягоны бацька будаваў Паўночна-Каўкаскую чыгунку... Бы кадры фільму плывуць перад вачыма. Вось зьледзянелы вакзал у Мінэральных Водах... Я складаю кінутыя лісты і кідаю ў печ. Лепей бы іх адсюль забралі ці хоць склалі ў тэчку. А так цяпер думай пра гэта ўсё жыцьцё.

Вось такое атрымалася ПМЖ. Геніяльна кажа мой муж: цяпер ёсьць дзе пусьціць карані. Дадам словамі, якія мудра мовіць у такіх выпадках наш сябра кінарэжысэр Алег Дашкевіч: «Ёсьць дзе акапацца!» А Ларса фон Трыера я магу паглядзець і ў Менску. 20 хвілінаў і трохі бэнзыну.

# *Кнігі поштай*



## НОВАЕ

руб.

**Беларускі гістарычны агляд. Том 9.** Сшытак 1—2 (16—17). 340 с. Навуковы часопіс. Аўтары нумару: Васіль Варонін, Ігар Клімаў, Agnieszka Kołasa-Nowak, Ігар Лялькоў, Jarosłav Pánek, Генадзь Сагановіч, Марына Сакалова. 4 200

**АРКУШ Алесь. Прывід вясны.** — Менск, 2003. — 64 с. Гэта першая кніга Алеся Аркуша, якая выходзіць у Менскім выдавецтве. Доўгі час лідэр Таварыства вольных літаратараў выдаваў свае зборнікі альбо ў Полацку, альбо за мяжою. У «Прывідзе вясны» аўтар паставіў за мэту стварыць канцэптуальны зборнік — з агульным тэмбрам паэтычнага маўленьня, скразной тэмай, сюррэалістычным зьместам. Некаторыя з гэтых вершаў ужо сталі хрэстаматыйнымі, увайшлі ў розныя анталёгіі, калектыўныя зборнікі: «Катрынка», «Над пожняй плачуць правады...», «Сталёвая рыба», «З майго сэрца вырасьце аер...», «Нанканфармізм». 4200

**Джэці. За здаровы лад жыцьця. Вершы.** — Менск, 2003. — 102 с. Назва «За здаровы лад жыцьця» гучыць нязвыкла для паэтычнай кнігі. Затое радасна і аптымістычна. Гэткай жа вясёлай афарбоўкай вызначаюцца і многія вершы кнігі, нягледзячы на экзыстэнцыйны, часам трагічны падтэкст. Як кажа пра сябе сама аўтарка, «я — бы недарэчная прыпеўка на грамадзка значным пахаваньні». Аб тым, наколькі гэта слушна, сьведчаць ейныя вершы, напоўненыя ўсё пранізьлівай іроніяй і самаіроніяй, нечаканымі вобразамі й парадаксальнымі высновамі. 4 200

**ГЕЛАГАЕЎ Алесь. Беларускія нацыянальныя вайсковыя фармацыі ў часе Другое сусьветнае вайны.** 72 с. 2 000

**БЫКАЎ Васіль. Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў.** 544 с. Гэтая кніга — успаміны народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава пра асабіста перажытае за амаль 70 гадоў ягонага багатага падзеямі жыцьця. Быкаў прапануе чытачу досьвед культурнага дзеяча, знакамітага пісьменьніка, выказвае думкі адносна будучага разьвіцьця краіны. 5 600

**ДЗЕЯСЛОЎ №5, 2003.** 256 с. У нумары: Уладзімер Арлоў, Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў, Анатоль Кудравец, Уладзімер Някляеў, Людміла Рублеўская, Андрэй Федарэнка, Андрэй Хадановіч ды іншыя. 4 000

**СТАНКЕВІЧ Ян. Гістарычныя творы.** — Менск: «Энцыкляпэдыкс», 2003. — 776 с., цьвёрдая вокладка. У том увайшлі гістарычныя творы Яна Станкевіча (1891—1976), напісаныя паміж 1930 і 1976 гадамі. Пераважная бальшыня апублікаваных твораў раней была недаступная беларускаму чытачу. 8 600

CD: **ЦЯРЭШЧАНКА Вальжына. Хтось крануўся крылаў.** Апошні альбом гомельскай бардэсы, 2003. 7 000

CD: **ЛІЦЬВІНЫ. Галуб на чарэшні, галубка на вішні.** © 1998. Адметнасьцю гэтага гурту зьяўляецца шырокае выкарыстаньне амаль забытых інструмэнтаў. Адным з галоўных музычных інструмэнтаў гурту зьяўляецца дуда — від эўрапейскай валынкі, вернуты ўжо зь нябыту намаганьнямі такіх майстроў-дасьледчыкаў, як Уладзімер Пузыня, Алесь Лось, Віктар Кульпін і інш. Разам з народнай манерай сьпеву і йгры традыцыйныя інструмэнты ствараюць характэрны для «Ліцьвіноў» спэцыфічны «вясковы» гукавы калярыт, «саўнд». 6 000

CD: **ЛІЦЬВІНЫ. Ой, у лузе-лузе...** © 1998. «Ліцьвіны» — адзін з найбольш прафэсійных і глыбокіх гуртоў, што граюць беларускую народную музыку, бо не імкнуцца наблізіць яе да эстрады. Праграма «Ой, у лузе, лузе...» складаецца з 16 твораў, у тым ліку вясельных і жалобных маршаў (www.svaboda.org). 6 000

Біб-ка БГА 12: **ЛІНДНЭР Райнэр. Гісторыкі і ўлада: Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка.** Пераклад зь нямецкай Л. Баршчэўскага, нав. рэд. Г. Сагановіча. 540 с., цьвёрдая вокл. Кніга нямецкага гісторыка Райнэра Ліндпэра зьяўляецца першым дасьледаваньнем узаемадачыненьняў гістарычнай навукі і палітыкі ў Беларусі. Бесстаронне аналізуючы шматбаковую сувязь паміж гісторыяй, фармаваньнем нацыі і дзяржаўнай палітыкай, аўтар стварае панараму інстытуцыйна-кадравых і канцэптуальна-зьместавых пераменаў у беларускай гістарыяграфіі ад яе станаўленьня да нашага часу. 14 000

**ЗАПІСЫ БЕЛАРУСКАГА ІНСТЫТУТУ НАВУКІ І МАСТАЦТВА №25. New York—Miensk, 2001.** 222 с. 2 800

**КІПЕЛЬ Вітаўт, САЎКА Зьміцер. Беларускія слоўнікі і энцыкляпэдыі. Бібліяграфія.** БІНіМ, Нью Ёрк — Менск, 2001. 570 с., цьвёрдая вокладка. Укладальнікі — дырэктар БІНіМу доктар Вітаўт Кіпель і навуковы супрацоўнік Зьміцер Саўка, які далучыўся да праекту ў 1997 годзе і быў запрошаны дзеля гэтага на адмысловую стыпэндыю. Выданьне падобнага даведніка ажыцьцёўленае ўпершыню, а праца над ім працягвалася амаль паўстагодзьдзя. Даведнік складаецца зь дзьвюх частак — каталягічнай (у трох каталёгах сабраныя зьвесткі пра беларускія слоўнікі і энцыкляпэдыі ад часоў Лаўрэнція Зізанія да сёлетніх выданьняў і публікацыяў, а таксама інфармацыя пра рукапісныя і электронныя слоўнікі ды картатэкі) і індэксавай (яна дае магчымасьць шукаць матэрыял паводле моваў, тэмаў, гадоў і месцаў выданьня, паводле тыпаў слоўнікаў, па асобах і мясьцінах). («Беларус», 2002, лістапад) 12 600

**Ks. D-r J. REŠEĆ. Z historyi apolohietyki chryścijanskaj.** Wilnia, 1928 h. Wydawiedstva «Cryścijanskaj Dumki». 104 с. 1 000

**КІПЕЛІ Зора і Вітаўт. Беларускі й беларусаведны друк на захадзе.** БІНіМ, Нью-Ёрк — Менск, 2003. 584 с., цьвёрдая вокладка. За два прамінулыя стагодзьдзі на Захадзе выдадзена больш за 4000 беларускіх кніг і манаграфічных выданьняў пра Беларусь. Беларускія эмігранты заснавалі 432 часопісы й газэты, якія выдаваліся ў многіх эўрапейскіх краінах, а таксама ў Аўстраліі ды абедзьвюх Амэрыках. Да нядаўняга часу было няпроста арыентавацца ў гэтым неабсяжным моры беларускіх выданьняў, але зьявіўся «компас» — кніга Зоры й Вітаўта Кіпеляў «Беларускі й беларусаведны друк на Захадзе» (www.svaboda.org). 12 600

**ГЛЁБУС Адам. Сшыткі:** Каралеўства Буды. Уцёкі ў Эгіпэт. Замежнікі. Барса. Мая Вільня. Мой Рым. Паветра Літвы. Празрысты Парыж. Лонданскі сшытак. — Менск: Харвест, 2003. — 480 с. Новая кніга Адама Глёбуса. 15 000

**СЛОЎНІК МОВЫ НАШАЙ НІВЫ (1906—1915). Том 1 (у 5 т.).** Пад рэд. В.П.Лемцюговай. — Менск: Тэхналёгія, 2003. — 624 с., цьвёрдая вокладка. Слоўнік заснаваны на лексычным матэрыяле, крыніцаю якога паслужыла першая масавая беларуская газэта «Наша Ніва» — унікальны пісьмовы помнік нацыянальнага адраджэньня пачатку XX стагодзьдзя. 14 000

**БОХАН Юры. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576.** Менск: Беларусь, 2003. — 88 с.: іл. Выданьне ставіць перад сабой мэту падаць у максымальна даступнай форме матэрыял, які паспрыяў бы разуменьню спэцыфікі разьвіцьця ваенна-тэхнічнай думкі на землях, што калісьці ўваходзілі ў склад шматэтнічнай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага. Прыводзяцца найлепшыя ўзоры выяўленчых крыніцаў, а таксама рэканструкцыі, выкананыя аўтарам, шэрагу мадэляў узбраеньняў, тыповых для розных адрэзкаў часу ў рамках адзначанага пэрыяду. Выданьне зацікавіць як спэцыялістаў, так і шырокае кола чытачоў. 5 400

CD: **ВОПЛІ ВІДОПЛЯСОВА. Країна Мрій.** © 1994. Цей альбом — для танців. Під звуки драйвових пісень ВВ не можна сидіти спокійно. З першої пісні по шістнадцяту ми намагаємось зламати підлогу, під звуки чарівної «Країни Мрій» відпочиваємо і... починаємо з початку! 6 000

**АРЛОЎ Уладзімер. Адкуль наш род: Апавяданьні з гісторыі Беларусі для малодшых школьнікаў.** 3-е выд. — Вільня: Наша Будучыня, 2003. — 127 с., цьвёрдая вокладка. Кнігу склалі займальныя і пазнавальныя апавяданьні з гісторыі Беларусі, пачынаючы ад тых часоў, калі на нашай зямлі зьявіліся першыя людзі, да Беларускай Народнай Рэспублікі. 10 000

**УІНТЭР Гэрберт Р, БЭЛОЎЗ Томас Дж. Канфлікт і кампраміс: уводзіны ў палітычную навуку.** Менск: Тэхналёгія, 2002. 507 с., цьвёр. вокл. Кніга напісаная для студэнтаў, якія робяць першыя крокі ў паліталёгіі і маюць намер спэцыялізавацца ў гэтай навуцы, а таксама для тых, хто абраў іншую галіну навукі, але хоча мець разуменьне прадмету паліталёгіі. 4 300

**ДЗЯДЗЕНКА Зьміцер. Аршанская шляхта.** 64 с. У кнізе падаецца гісторыка-генэалягічны агляд шляхецкіх родаў, прадстаўнікі якіх увайшлі ў гісторыю Аршаншчыны. На старонках выданьня згадваюцца роды Сапегаў, Сангушкаў, князёў Друцкіх і інш. Пры падрыхтоўцы выкарыстоўваліся як рэдкія выданьні XVIII—XIX ст., так і архіўныя дакумэнты. 1 400

**150 ПЫТАНЬНЯЎ І АДКАЗАЎ З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ.** 238 С., цьвёрдая вокладка, укл. і прадм. — Зьм. Санько, І. Саверчанка. У папулярнай форме падаюцца разнастайныя зьвесткі зь беларускай гісторыі пра найважнейшыя падзеі мінулага, пра выдатных дзяржаўных асобаў, славутых герояў, дзеячоў культуры і інш. Адрасуецца шырокаму колу чытачоў. 10 000

**ARCHE-Пачатак №1, 2002.** 184 с. 1 500

**ARCHE-Пачатак №2, 2002.** 256 с. Тэма нумару — «Нашы дзеткі». 1 900

**ARCHE-Пачатак №3, 2002.** 296с. Тэма нумару — «Андрэй Хадановіч» 2 000

**ARCHE-Пачатак №1, 2003.** 208 с. Тэма нумару — «Расейскае пытаньне». 2 000

**ARCHE-Пачатак №2, 2003.** 200 с. Тэма нумару — «Туманнасьці беларускай гісторыі». 2 000

**ARCHE-Пачатак №3**, **2003.** 240 с. Тэма нумару — «Pax Americana» (Сьвет паводле Амэрыкі). 2 200

**ARCHE-Пачатак №4**, **2003.** 240 с. Тэма нумару — «Чэскі альбом». 2 200

**MARA Алесь. Аўтаманаграфія.** 168 с. Гэта своеасаблівы літаратурна-мастацкі праект, спраўджаны на старонках альбому, дзе, акрамя рэпрадукцыяў твораў, можна пабачыць дакумэнтальныя фота, вершы, дзённікавыя запісы. 25 000

Vostraja Brama 0: **ГЛЁБУС Адам. Post Scriptum**. 176 с. 3 000

Vostraja Brama 3: **ЛУКАШУК Аляксандар.** У фіялетавай ночы вугал крыла. 160 с. 3 000

Vostraja Brama 4: **БАРТОСІК Зьміцер. Чорны пісталет.** Апавяданьні з уласнага жыцьця. 240 с. Кнігу складаюць тэксты, якія друкаваліся на працягу апошніх дзесяці гадоў у газэце «Наша Ніва» і гучалі на радыё «Свабода» ў перадачы «Вострая брама». 6 000

Vostraja Brama 5: **ГЛЁБУС Адам. Браслаўская стыгмата.** 192 с. Новая кніга Адама Глёбуса, якую склалі апавяданьні апошніх гадоў. 3 000

Vostraja Brama 7: **АРЛОЎ Уладзімер. Адкусі галаву вароне**. 176 с. Новую кнігу Ўладзімера Арлова склалі эсэ апошніх гадоў. Аўтар, у жылах якога беларуская кроў зьмяшаная з цыганскай, працягвае вандраваць па сьвеце й часе. 5 600

**Поўны каталёг** з анатацыямі і вокладкамі глядзіце на сайце **http://www.knihi.net**

Атрымаць кнігі можна таксама і накладной платай (далей — НП), г. зн. аплата — па атрыманьні на пошце. Для гэтага трэба даслаць ліст з замовай на адрас: **п/с 333, 220050, Менск** (без пазнакі «Кнігі — поштай»), пазначыўшы сваё ймя, імя па бацьку, прозьвішча і падрабязны адрас (для хуткасьці — тэлефон, e-mail, пэйджэр). Пры дасылцы НП зьніжкі ня дзейнічаюць. Цэны ў каталёгу — для Менску. Для рэгіёнаў зьніжка 10% (толькі пры перадаплаце). Замову можна даслаць на e-mail **EXLIBRIS@TUT.BY** ці патэлефанаваць **8-029-643-57-33**.

# Свая астраномія



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Першы беларускі падручнік астраноміі для школьнікаў склалі Іларыён Галуза, Уладзімер Голубеў і Аляксандар Шымбалёў (на здымку) — ён жа айцец Аляксандар, праваслаўны сьвятар, што служыць у катэдральным Сьвята-Духавым саборы.**

Падручнік надрукаваны на замову Мінадукацыі, выдадзены ён па-беларуску й па-расейску. У дапаможнік, апрача ўласна астранамічных зьвестак, увайшлі згадкі пра беларускіх астраномаў, а таксама пералік астэроідаў зь беларускімі назвамі. Назвы даваліся «геаграфічныя» (Беларусь, Берасьце, Лясная, Менск) і «асабовыя» — на імёны навукоўцаў і славутасьцяў (Алегія, Блажко, Жангаловіч, Ціхаў, Цераскія, Шміт, Шагал).

Сьпіс далёка ня поўны. На свае астэроіды чакаюць яшчэ імёны стваральніка Віленскай астранамічнай абсэрваторыі Марціна Пачобута-Адляніцкага, яго калегі Яна Сьнядэцкага — славутых навукоўцаў XVIII—XIX ст., а таксама таленавітых астраномаў-самавукаў Язэпа Драздовіча й Радаслава Астроўскага.

Перачытаўшы працы Драздовіча, а.Аляксандар застаўся ня дужа задаволены навуковай мовай: «Ён навыдумляў незразумелых тэрмінаў, якія больш нідзе не ўжываліся. Я ягоныя наватворы больш-менш разабраў, а людзі, якія ня маюць астранамічнай адукацыі, наўрад ці дадуць рады». У аддзеле рэдкай кнігі Нацыянальнай бібліятэкі знайшоў А.Шымбалёў і курс лекцыяў па астраноміі Радаслава Астроўскага, выдадзены Віленскай беларускай гімназіяй: «Астроўскі і дырэктарам быў, і астраномію выкладаў. Яго курс напісаны вельмі проста, для вучняў, вельмі зразумела і добрай беларускай мовай. Клясычная астраномія выкладзеная добра, але зьвесткі пра плянэты, сузор'і і туманнасьці на сёньня вельмі састарэлі». Саму працу Астроўскага назваць падручнікам складана: набраная на друкарцы і памножаная на гектографе, кніга якасьцю больш нагадвае «самапальную» брашуру, чым школьны падручнік. «Наш усё ж такі першы», — пасьміхаецца а.Аляксандар.

На астранома ён вучыўся ў Адэскім унівэрсытэце, бо ў Беларусі не навучаюць на такую спэцыяльнасьць. Ужо сем гадоў Шымбалёў выкладае ў Белдзяржпэдунівэрсытэце імя Максіма Танка. На пытаньне, ці не замінае астраномія Боскаму служэньню, а.Аляксандар адказвае, што ня бачыць ніякай супярэчнасьці паміж навукай і рэлігіяй: «Усе навукоўцы былі вернікамі: і Капернік, і Галілей, і Ньютан». На супастаўленьне навуковых ведаў і Бібліі сьвятар пазірае паблажліва: «Навука ўвесь час зьмяняецца, а Біблія — кніга вечная. Вось тэорыю Вялікага выбуху, зь якога нібыта пачаўся Сусьвет, адзін з Папаў падтрымаў. Дык яго потым за гэта шмат папракалі — і навукоўцы, і тэолягі. Навука будзе разьвівацца далей — што рабіць, калі высьветліцца, што гэта няслушная тэорыя? А Папа яе ўжо кананізаваў, як раней гэта было з Пталамеевай карцінай сьвету».

**Адам Воршыч**

# Проза за пяцьдзясят гадоў




**Беларуская сучасная проза:** Традыцыі і наватарства / Уклад. У.Сіўчыкава, М.Тычыны. — Менск: Сэр-Віт, 2003

Што ж узята ўкладальнікамі за аснову падчас вызначэньня межаў «сучаснага пэрыяду»? Трэба меркаваць — сьмерць Сталіна. Самае раньняе тут апавяданьне Мележа «Чулае сэрца» (успаміны пра сустрэчу з Чорным) было надрукаванае 3 сьнежня 1953 г. Ёсьць у анталёгіі й творы, што зьявіліся сёлета, — напрыклад, «Скрыпка» Галіны Васілеўскай.

Валянцін Акудовіч у «Горадзе, якога няма» разглядае пытаньне — ці можна любіць Менск. Адказ пэсымістычны. Ёсьць і клясычнае «Смаленьне вепрука» Міхася Стральцова, і фантастыка з фантасмагорыяй: творы Алега Мінкіна, Лявона Вольскага, Сяргея Рублеўскага. Дэтэктыўны жанр прадстаўляе Максім Клімковіч. Гістарычны — Вольга Іпатава. З Караткевіча ўзятае рамантычна-трагічнае апавяданьне «Сіняя-сіняя». Суровую прозу сучаснага жыцьця ўзнаўляюць Юры Станкевіч, Андрэй Федарэнка, Уладзімер Сіўчыкаў і інш. А Ўладзімер Сьцяпан нечакана прапануе паэтычную мініятуру «Півоня».

Знайшлі свае месца ў кнізе і традыцыйныя для нашай літаратуры абразкі: у адным зь іх лідэр літаратурнай Беласточчыны Сакрат Яновіч распавядае, як ён стаў беларусам. З даробку Васіля Быкава ўзятая прыпавесьць «Музыка». Кніга, дарэчы, прысьвечаная яго памяці.

Апошні з магіканаў сацрэалізму Іван Шамякін распавядае, адкуль узяўся «міт пра збавіцеля Панамарэнку» і як ён сам гэтаму спрыяў («Панцеляймонава кіно»). На маю думку, трэба чытаць абавязкова. Кніга каштуе каля 6000 рублёў.

**Усяслаў Шатэрнік**

IN MEMORIAM

# Як здымаў Клімаў

**У нядзелю 26 кастрычніка памёр кінарэжысэр Элем Клімаў. Амаль дваццаць гадоў таму на экраны выйшаў фільм «Ідзі й глядзі» паводле «Хатынскай аповесьці» Алеся Адамовіча. Як казаў сам рэжысэр, гэта была галоўная карціна ў ягоным жыцьці. У працы над стужкай браў удзел кінарэжысэр зь Менску Юры Аксанчанка. Зь ім гутарыць карэспандэнт «НН».**

**«НН»: Як вы пазнаёміліся з Клімавым?**

**Юры Аксанчанка:** Мне хацелася папрацаваць у яго стажорам. Клімаў спачатку адмовіўся. Відаць, насьцярожыў нечаканы візыт: а раптам незнаёмца аднекуль «прыслалі»? Але праз некаторы час група пераехала ў Маскву, і мяне туды выклікалі. Там усе атрымалі заданьне шукаць кандыдатаў на ролі. Мы езьдзілі і здымалі, напрыклад, дзяцей на відэа без усялякіх загадзя падрыхтаваных для іх тэкстаў. У фільме, дарэчы, няма ніводнага колькі-небудзь вядомага актора.

Выканаўца галоўнай ролі Алёша Краўчанка знайшоўся пад Ленінградам. Удзел у фільме Клімава гарантаваў яму паступленьне ў Ленінградзкі інстытут кінэматаграфіі. Але ён адмовіўся. Тым ня менш, урэшце стаў-такі акторам. Цяпер яго можна бачыць у тэлесэрыяле «Спэцназ» у ролі Дока.

**«НН»: Удалося пабачыць, як Клімаў працуе з акторамі?**

**Ю.А.:** Элем вельмі рупліва ставіўся да сваіх прафэсійных сакрэтаў. Хадзілі, напрыклад, чуткі, што зь некаторымі акторамі на ягоных фільмах працавалі гіпнатызэры. Ня ведаю. З акторамі ён, сапраўды, працаваў індывідуальна, асабліва з выканаўцам галоўнай ролі. Мы ведалі, што з хлопчыкам працуюць таксама псыхіятар і выхавацельніца. Прычым выхавацельніца карысталася нетрадыцыйнымі на той час мэтадамі: вучыла, скажам, зараджацца энэргіяй ад дрэваў, ад прыроды ўвогуле. Але мы гэтых людзей на здымках ня бачылі — яны заставаліся ў гатэлі для актораў.

Клімаў дамагаўся, каб выканаўца ня проста ўжыўся ў ролю, а менавіта пражыў яе эмацыйна. Таму ўсе эпізоды фільму здымаліся пасьлядоўна — так, як гэта адбываецца ў аповесьці Адамовіча, дзе драматызм нарастае ад эпізоду да эпізоду і завяршаецца трагедыяй. Для кіно, дзе нярэдка спачатку здымаюць фінал, а потым ужо іншыя эпізоды, такі падыход быў абсалютна незвычайны. І ў гэтым была складанасьць — бо ўсю карціну трэба было зьняць за адзін сэзон.

Пры гэтым за савецкім часам якасная кінастужка была дэфіцытам, і «кодак» на здымкі выдалі практычна адзін да аднаго. Кожны эпізод трэ было здымаць бяз дубляў, зь першага разу!

Там, калі памятаеце, дзеяньне адбываецца да пачатку восені. А фінальную сцэну давялося здымаць ужо ў лістападзе. Мы вярнуліся пасьля выходных у Бярэзінскі запаведнік і ўбачылі, што ўсё замерзла. Лёд на лужынах разьбівалі сякерамі й вылоўлівалі крыгі рыбацкімі сачкамі. Сьнег змывалі з дрэваў пажарныя машыны. Але ў глыбіні лесу сьнег, зразумела, застаўся. Вось і выйшла, што партызаны адыходзяць з восені ў зіму. Гэта апошні кадар. Можна сказаць, што рэжысэру папросту выпадкова пашанцавала. Але ведаеце — шанцуе таму, хто шукае.

**«НН»: Усё гэта ствярала на пляцоўцы нэрвовую напружанасьць?**

**Ю.А.:** Клімаў быў гранічна інтэлігентным чалавекам, грубага слова ад яго ніхто ня чуў. Ніякіх спрэчак папросту не ўзьнікала. Ён нікому нічога не дыктаваў — усё адбывалася як бы само сабой.

Бывалі, зразумела, і збоі. На беразе Бярэзіны купілі пару хатаў, яшчэ некалькі прывезьлі з навакольных вёсак. Узьнікла як бы вуліца, прызначаная для таго, каб згарэць на здымках ключавога эпізоду. Але падчас адной з рэпэтыцыяў, калі здымачная група яшчэ не была гатовая, нехта памылкова загадаў усё гэта спаліць напалмам.

**«НН»: А як складаліся адносіны з Адамовічам падчас працы над фільмам?**

**Ю.А.:** Адамовіч прысутнічаў на здымках. Часта ён прасіў мясцовых жыхароў з масоўкі расказваць, што яны памятаюць з вайны. Фільм выйшаў вельмі блізкім да сцэнару. Зьмены, што ўносіліся, былі прадыктаваныя тым, што ад моманту напісаньня сцэнару да пачатку здымак прайшло амаль дзесяць гадоў. Пачатковы ж сцэнар называўся «Забіце Гітлера!».

Да Адамовіча ўзьнiклі прэтэнзіі ў ЦК КПБ і ў Дзяржкіно яшчэ на этапе працы над сцэнарам. Нават назва не задавальняла начальства. Фільм тады ня быў запушчаны ў вытворчасьць. Карціна «Ідзі й глядзі» выйшла на экраны ўжо пры Гарбачову.



На здымках «Ідзі і глядзі». Трэці зьлева — Элем Клімаў

**Гутарыў Віталь Тарас**

# Натаўскія «маткі» пры расейскай мяжы



За кожны ўзьлёт-пасадку самалёта NATO кіргізы атрымліваюць 6 тыс. «зялёных»

**Пяцьсот вайскоўцаў і пятнаццаць самалётаў, дысьлякаваныя на расейскай базе ў Кыргызстане, — нішто ў параўнаньні з магутным кантынгентам NATO ў Цэнтральнай Азіі. Расея будзе граць у рэгіёне тую ролю, якую ёй даручыць Захад.**

23 кастрычніка ў Канце, недалёка ад Бішкеку, пачала функцыянаваць першая на постсавецкай прасторы база расейскіх ВПС. За 30 км ад Канту, у Манасе, знаходзіцца буйная база NATO. Расейскія мэдыі падкрэсьліваюць, што такое суседзтва абумоўлена «поўнай гармоніяй інтарэсаў». Маўляў, мэта знаходжаньня войскаў у Цэнтральнай Азіі — сумесная барацьба зь міжнародным тэрарызмам. Але чаму пры такім «супадзеньні інтарэсаў» Расея дагэтуль не ўвайшла ў NATO?

У пачатку лістапада 2001 г., праз два месяцы пасьля руйнаваньня Сусьветнага гандлёвага цэнтру, Тоні Блэр прапанаваў прыняць Расею ў альянс. Насамрэч гэтую прынаду рукамі Блэра Пуціну закідала Амэрыка. Вашынгтон шукаў магчымасьці разьмясьціць кантынгенты NATO ў Кыргызстане, на кірунку, важным для кантролю над Цэнтральнай Азіяй. Амэрыка клапацілася пра свае буйныя эканамічныя праекты, зьвязаныя з выхадам вялікай казахстанскай і азэрбайджанскай нафты на заходні рынак. Маючы моцныя пазыцыі ў Кыргызстане, Вашынгтон атрымліваў магчымасьць уплываць і на разьмеркаваньне вады ў рэгіёне.

Таму 12 лістапада 2001 г., падчас сустрэчы прэзыдэнтаў ЗША і Расеі на тэхаскім ранча, Буш прыклаў усе намаганьні, каб пераканаць Пуціна ў рэальнасьці далучэньня Расеі да альянсу. Удалося. І пры канцы лістапада пачалося разгортваньне базы альянсу ў Манасе. Бішкек ад гэтага выйграў — атрымаў 200 млн даляраў інвэстыцыяў. А за кожны ўзьлёт-пасадку самалёта NATO кіргізы атрымліваюць 6 тыс. «зялёных». Расея ж хутка расчаравалася ў паўночнаатлянтычных партнэрах. Спачатку Рада NATO прыняла рэзалюцыю аб новых чальцах, у ліку якіх былі і краіны Балтыі. Пасьля ЗША выйшлі з дамовы аб супрацьракетнай абароне: амэрыканская перавага ў вайсковай магутнасьці пашыралася і на блізкі космас.

Кропка ў працяглай гульні альянсу з Масквой была пастаўленая падчас сустрэчы прэзыдэнтаў Расеі і ЗША ў траўні 2002 г. Буш запатрабаваў, каб Расея адмовілася ад вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва зь ненадзейным Іранам — і страціла больш за 7 млрд даляраў гешэфту. Пры гэтым не ішло ніякай гаворкі аб магчымасьці чалецтва Расеі ў NATO.

## Стаўка на Ўзбэкістан

Заходнія інвэстыцыі ўкладаюцца ня толькі ў эканоміку цэнтральнаазіяцкіх і закаўкаскіх краінаў СНД, але і ў іх войска. У 2002 г. ЗША ўклалі 28 млн даляраў у разьвіцьцё мабільных сілаў Грузіі. Азэрбайджан атрымаў ад Турцыі сучаснае зброі на 15 млн. Вашынгтон фінансаваў і мадэрнізацыю паветрана-дэсантных войскаў Казахстану.

Курсанты з Грузіі, Азэрбайджану, Казахстану і Ўзбэкістану вучацца ў вайсковых ВНУ Злучаных Штатаў, кадравыя вайскоўцы за амэрыканскія грошы стажыюцца ў Штатах і Турцыі. Сярод генэралітэту закаўкаскіх ды цэнтральнаазіяцкіх войскаў пашыраюцца празаходнія настроі.

ЗША ўзялі шэфства і над узброенымі сіламі 25-мільённага Ўзбэкістану — самай магутнай дзяржавы Цэнтральнай Азіі. Ён дапаможа Амэрыцы дамінаваць у багатым нафтай і газам цэнтральнаазіяцкім рэгіёне. Два ўзбэцкія паветрана-дэсантныя батальёны муштруюць амэрыканскія «камандас». Увогуле ж у складзе ўзбэцкага войска ёсьць чатыры паветрана-дэсантныя брыгады, якія можна хутка перакінуць у любую частку Цэнтральнай Азіі.

## Рабі што кажуць

Базы NATO знаходзяцца ў стратэгічна важных для кантролю над Закаўказьзем і Цэнтральнай Азіяй пунктах. У Вазіяні, недалёка ад Тбілісі, разгорнутыя часьці амэрыканскіх «камандас». У Марнэулі (Грузія) і Кюрдаміры (Азэрбайджан) сканчаецца будаўніцтва буйных вайскова-паветраных базаў NATO. У Ханабадзе (Узбэкістан) знаходзіцца дзьве тысячы амэрыканскіх вайскоўцаў. Такі ж колькасьцю кантынгент разьмешчаны ў Манасе (Кыргызстан). На базах у Ханабадзе і Манасе больш за 200 натаўскіх самалётаў.

На жаргоне амэрыканскіх вайскоўцаў базы ў Вазіяні, Ханабадзе і Манасе называюцца «маткамі». Пры неабходнасьці кантынгенты, дысьлякаваныя тут, могуць быць хутка павялічаныя. Запасы ж харчаваньня і зброі дазваляюць дваццаці тысячам вайскоўцаў шэсьць месяцаў аўтаномна весьці баявыя дзеяньні.

У пачатку красавіка 2002 г. Пуцін заявіў, што супрацоўніцтва былых паўднёвых рэспублік СССР з альянсам «не супярэчыць інтарэсам Расеі». Дзяржава, гадавы бюджэт якой складае менш за чвэрць вайсковых выдаткаў ЗША, імкнулася захаваць свой твар. 500 вайскоўцаў і 15 самалётаў, дысьлякаваныя на расейскай базе ў Канце, істотна не ўплываюць на раскладку сілаў у Цэнтральнай Азіі. Расея вымушаная граць у рэгіёне тую ролю, якую ёй даручыць Захад. Вайсковая прысутнасьць Расеі ў нестабільным Таджыкістане і Кыргызстане адпавядае імкненьню ЗША не дапусьціць узмацненьня ў рэгіёне пазыцыяў Кітаю.

## Фактар ціску

Базы NATO на поўдні СНД — яшчэ й моцны фактар ціску на Маскву. У верасьні 2002 г., пасьля расейскіх ракетна-бомбавых удараў па Панкіскай цясьніне, Расеі было заяўлена, што дзеяньні яе авіяцыі ствараюць прэцэдэнт для канфлікту з NATO.

Альянс выконвае ролю абаронца незалежнасьці і сувэрэнітэту постсавецкіх краін і на ўсходзе Эўропы. 1—15 сакавіка 2002 г. у Польшчы, побач з Калінінградам, прайшлі вучэньні NATO «Strong Revolve-2002» (Цьвёрдая рашучасьць-2002»), у якіх узялі ўдзел больш за 40 тыс. вайскоўцаў. Абурэньне Масквы выклікаў сцэнар манэўраў: пасьля абвастрэньня стасункаў паміж дзьвюма краінамі, якія раней уваходзілі ў склад адной дзяржавы, узброеныя сілы большай урываюцца на суседзкую тэрыторыю з мэтай «перагляду існых дзяржаўных межаў». Сілы NATO ўваходзяць на тэрыторыю краіны, якая зазнала агрэсію, і забясьпечваюць захаваньне яе незалежнасьці і тэрытарыяльнага адзінства.

У першыя дні працы рэспубліканскай адміністрацыі ЗША расейскія мэдыі вельмі часта цытавалі словы дзяржсакратара Коліна Паўэла: «ЗША не дапусьціць умяшаньня Расеі ва ўнутраныя справы краінаў СНД, бо аднаўленьне Савецкага Саюзу альбо Расейскай імпэрыі не адпавядае інтарэсам Амэрыкі». У сьвятле пашырэньня NATO на ўсход і ўзмацненьня пазыцый Захаду на постсавецкай прасторы выказваньне Паўэла ёсьць яшчэ больш актуальным для тых колаў палітычнай эліты Расеі, якім не даюць спакою імпэрскія амбіцыі.

**Андрэй Ляховіч**

## • НАВІНЫ •

### Скрадзены спонсар Пуціна

**Аляксандар Караткоў, віцэ-прэзыдэнт фонду падтрымкі «Адзіная Расея», быў скрадзены ў аўторак увечары.** Адбылося гэта каля маскоўскай станцыі мэтро «Аэрапорт», дзе ў прадпрымальніка была прызначаная якаясьці сустрэча. Пошук злачынцаў, якія запхнулі Караткова ў «Жыгулі», выніку ня даў. Фонд Караткова — неафішаваны спонсар расейскай партыі ўлады. У кастрычніку ён перавёў на рахунак «Адзінай Расеі» 2 млн 300 тыс. рублёў (каля 78 тыс. даляраў).

**СМ**

### Цімашэвіч гатовы да кампрамісу

**Міністар замежных справаў Польшчы Ўладзімер Цімашэвіч заявіў, што краіна гатовая зьменшыць кошты візаў для беларусаў нават удвая,** але толькі пры ўмове ўзаемнасьці — каб Менск пагадзіўся выдаваць палякам беларускія візы таксама ўдвая таньней.

Прамаўляючы ў Беластоку, Цімашэвіч сказаў, што адмяніць візы для беларусаў Польшча ня можа, бо Менск адмовіўся ад г.зв. «украінскага варыянту» — калі палякі едуць у пэўную краіну ўвогуле бяз візаў узамен на бясплатныя польскія візы для грамадзянаў гэтай краіны.

### Інтэрнэт на вуліцы

**Ва Ўроцлаве ад гэтага тыдня можна бясплатна падключацца да бесправаднога Інтэрнэту проста на вуліцы.** Для гэтага, што праўда, трэба мець ноўтбук з адпаведнай картай. Пакуль Інтэрнэт «цягне» толькі на Рынкавай плошчы, але ўжо ў хуткім часе падключыцца можна будзе і ў яшчэ адным раёне Ўроцлава — дзе жыве бальшыня студэнтаў.

### Забойца хацеў на рэфэрэндум

**Вязень адной з польскіх турмаў накіраваў у суд пазоў супраць кіраўніцтва гэтай установы: яму не далі магчымасьці ўзяць удзел у травеньскім рэфэрэндуме аб далучэньні Польшчы да Эўразьвязу.** Яго прозьвішча было выпадкова ня ўключанае ў сьпіс выбарцаў. Цяпер вязень, які атрымаў 14 гадоў за забойства, жадае кампэнсацыі ў памеры 100 тыс. злотых (25 тыс. даляраў), бо, як кажа, удзел у рэфэрэндуме, які ніколі ўжо не паўторыцца, быў для яго надзвычай важным.

**АДз, Варшава**

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОЛЬСКІ ДОСЬВЕД

# Міраслаў Зяліньскі: У беларускім бізнэсе поўны парадак

**Гандлёвыя кантакты паміж Польшчай і Беларусяй разьвіваюцца хутка, хоць іх узровень нездавальняючы, лічыць намесьнік міністра эканомікі Польшчы, адказны за замежнаэканамічныя сувязі Міраслаў Зяліньскі.** Паводле яго словаў, Беларусь для польскага бізнэсу — рынак прывабны і вельмі бясьпечны. Таму як мага хутчэй трэба павялічыць гандлёвы абарот паміж нашымі дзяржавамі.

«Паўмільярда даляраў — гэта сапраўды нямнога, хаця нельга сказаць, што нашыя гандлёвыя кантакты прыпыненыя, — кажа М.Зяліньскі. — Яны разьвіваюцца актыўна: летась 260 млн даляраў экспарту і 227 млн даляраў імпарту. За восем месяцаў гэтага году мы адзначылі павелічэньне тавараабароту на 47%! Значыць, назіраецца вялікая дынаміка, хоць, з польскага пункту гледжаньня, баланс нашых кантактаў адмоўны. Польшча ўпершыню за некалькі гадоў больш імпартуе зь Беларусі, чым экспартуе туды. А гэта таму, што мы пачалі купляць у Беларусі нафтапрадукты. Мы надаём вялікае значэньне гандлю й эканамічным кантактам зь Менскам. Напрыклад, кансорцыюм польскіх фірмаў будзе неўзабаве браць удзел у тэндэры на пабудову ў Гарадні новай ЦЭЦ. Кантракт можа каштаваць нават 120 млн даляраў. Мы спадзяёмся, што, з увагі на геаграфічную блізкасьць, нам удасца яго выйграць. Магчыма таксама, што новая станцыя будзе працаваць на польскім вугалі. Значыць, ёсьць за што змагацца».

**— А ці няма небясьпекі, што грошы, якія дасьць польскі бізнэс, прападуць? Многа гаворыцца пра тое, што ўсходнія рынкі небясьпечныя, а беларускі рынак, у сувязі зь нестабільнай палітычнай сытуацыяй, яшчэ больш небясьпечны, бо непрадказальны.**

**М.З.:** Беларусь зьяўляецца ўпарадкаваным рынкам. І ні ў якім выпадку нельга назваць яго небясьпечным. Сярод трох нашых усходніх партнэраў Беларусь намнога апярэджвае Расею й Украіну. Зразумела, рынкавыя рэформы тут не знаходзяцца на такім узроўні, як у Расеі ці нават ва Ўкраіне, ня кажучы ўжо пра Польшчу. Але ў бізнэсе поўны парадак, і супрацоўнічаць зь Беларусяй вельмі лёгка. Тым больш што Беларусь прызнае польскі злоты ў якасьці канвэрсоўнай валюты і польскія фірмы могуць весьці разьлікі ва ўласнай валюце. Мне здаецца, што менавіта гэты факт сьведчыць пра значэньне, якое Беларусь надае кантактам з Польшчай.

**— У сваю чаргу Польшча таксама больш прыхільным вокам паглядзела на Беларусь. Гэтая дзяржава была ўключаная ў сьпіс краінаў, гандлёвыя апэрацыі зь якімі адбываюцца пад гарантыі польскага ўраду. Карпарацыя страхаваньня экспартных крэдытаў будзе вяртаць польскім фірмам грошы, калі іх бізнэс у Беларусі ня ўдасца.**

**М.З.:** Для такіх страхаваньняў ня будзе абмежаваньняў. Карпарацыя будзе страхаваць сумы дамоваў паміж польскімі й беларускімі фірмамі, а гэта значыць, што палякі больш ахвотна будуць супрацоўнічаць зь беларусамі. Тым больш, як мы ўжо сказалі, — інвэстыцыйная рызыка ў Беларусі намнога меншая, чым у іншых краінах былога Савецкага Саюзу.

**— Уступленьне Польшчы ў Эўразьвяз не замарозіць гандлёвыя кантакты зь Беларусяй?**

**М.З.:** Уваходжаньне Польшчы ў эўраструктуры, у мытную зону Зьвязу будзе толькі спрыяць разьвіцьцю гэтых кантактаў. Як зь Беларусяй, так і з іншымі ўсходнімі дзяржавамі. Па-першае, беларускім таварам будзе прасьцей трапіць на польскі рынак. Мытныя стаўкі Зьвязу значна меншыя, чым сёньняшнія польскія, і мы вымушаныя будзем іх паніжаць. Па-другое, тавар, імпартаваны зь Беларусі, будзе аўтаматычна трапляць на агульнаэўрапейскі рынак. Гэта павінна зацікавіць беларускіх прадпрымальнікаў. Зь іншага боку, калі гаварыць пра польскі экспарт, то, маючы доступ да вялікага эўрапейскага рынку, польскія фірмы змогуць, напрыклад, хутчэй пастаўляць тавары ці запчасткі ў Беларусь. І праз гэта рабіцца больш канкурэнтаздольнымі.

**Ялянта Сьмялоўская,**
Беларуская служба радыё «Палёнія»

# Кіно пасьля акупацыі

**Карціна Андрэя Кудзіненкі «Акупацыя» вяртае беларускае кіно да спрадвечнай і амаль забытай мэты мастацтва — зьдзіўляць, ачышчаць, агаломшваць. Выклікаць катарсыс.**


“Бацька”
“Маці”
“Адам і Ева”
КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

«Акупацыя» радыкальна розьніцца ад млявых беларускіх гісторый апошніх часоў. Фільм вылучаецца моцнай і сьвежай рэжысурай, назначанай аўтарскай пазыцыяй. Калі ў карціне «Настасься Слуцкая» Сьвятлана Зелянкоўская ператвораная ў бесканфліктную марыянэтку мыльнаопэрнай гісторыі, дык у фільме Кудзіненкі — выхаванца Віктара Турава — талент гэтай актрысы раскрываецца напоўніцу: гэта сама жарсьць, архетыпічная й пажадлівая Ева, жывы чалавек з крыві й плоці. Калі сцэнар Аляксандра Качана ў карціне «Павадыр» увасабляецца як гісторыя нат не барацьбы, а залагоджваньня лепшага найлепшым — дык ягоны ж сцэнар у «Акупацыі» крываточыць і скаланае гледача.

Фільм складаецца з трох навэл. Першая, «Адам і Ева», была зьнятая два гады таму і называлася «Партызанская містэрыя». Сёлета да яе далучаныя яшчэ дзьве містэрыі — «Маці» і «Бацька». Атрымалася цэласнае поўнамэтражнае кіно.

Калі мы спачатку яшчэ сьмяёмся («Адам і Ева» — гэта містэрыя-іронія), дык потым нам сьціскае горла ад суперажываньня мацярынскай бядзе. А містэрыя-прыпавесьць «Бацька» пакідае нас у трывожным і раздумлівым чаканьні. У кожнай гісторыі ёсьць трагічная памылка, якую выправіць немагчыма. Вясковы хлопец Адам (Аляксандар Маўчанаў), які йшоў у партызаны, застаецца на хутары ў абдымках каханай. Ён трапляе ў пастку жаночых чараў і нат забівае свайго правадніка Штыркіна. Нямая жанчына ратуе параненага нацыста, які замяняе ёй сына, што загінуў. Маленькі хлопчык так імкнецца адшукаць зьніклага бацьку, што прыводзіць у дом людзей, якія забіваюць яго айчыма і маці.

Скразным пэрсанажам усіх містэрый зьяўляецца партызанскі вяака Штыркін у бліскучым выкананьні Аляксандра Колбышава. У першай частцы яго забіваюць, але ён пасьляхова «ўваскрасае»: гісторыі наўмысна ідуць у адваротным парадку. (Прывітаньне Тарантына й Орсану Ўэлсу.)

«Аляксандар Колбышаў сыграў падонка!» — абураўся высокі кіначыноўнік у даносе-рэцэнзіі. Штыркін — не хрэстаматыйны беларусьфільмаўскі партызан; яго найбліжэйшыя «сваякі» — хутчэй, пэрсанажы Плаўтавых камэдый. Гэта балаганны выхваляка, які зграбна-чароўным жэстам расьпіхвае па кішэнях скрадзенае, занюхвае коткай гарэлку — ну папросту недаравальны паклёп на сьветлы вобраз партызана і «старэйшага брата». Але за сьмехам бачацца рэчы сур’ёзныя. Ці ня ёсьць Штыркін Мікітам Зноскам свайго часу, з тымі ж пакутамі рабства й прыстасавальніцтва?

Акторскія працы ў карціне дакладныя, трапныя, вывераныя і неверагодна жывыя. Маці (Алена Сідарава) цягне параненага, хапае ротам паветра, высільваецца — амаль адчувальная пакута цела на белай прасторы сьнегу — такое было ў дакумэнтальным фільме Віктара Дашука.

«Гэта проста нейкая жывёльнасьць», — абуралася адна глядачка. Як так? Жанчына корміць параненага нямецкага жаўнера ўласным малаком. Але гэта глядзіцца як неабмежаванае мацярынскае дараваньне. Гэты эпізод у сцэнары сапраўды меў моцныя біялягічныя й фрайдысцкія элемэнты, але рэжысэр зьняў рызыкоўныя сцэны настолькі тактоўна, наколькі гэта ўвогуле было магчыма.

> На здымачнай пляцоўцы маладога драматурга Андрэя Курэйчыка шматкроць «зьбівалі» й па некалькі дубляў запар кідалі ў сьнег.

А апошнія кадры «Маці», калі нямая жанчына, каб вярнуць наваэнойдзенага сына, падпальвае ўласную хату і грае на падораным губным гармоніку, шокава й палемічна спасылаюцца на «Знак бяды». Андрэй Кудзіненка хацеў паказаць сваю карціну Быкаву, але мантаж фільму быў завершаны 22 чэрвеня, у дзень сьмерці пісьменьніка.

Ролю зацятага нацыста выканаў Андрэй Курэйчык. На здымачнай пляцоўцы маладога драматурга шматкроць «зьбівалі» й па некалькі дубляў запар кідалі ў сьнег. «Гэта табе ня п’ескі пісаць!» — пасьмейваліся акторы-«паліцаі». Мастакі, якія глядзелі карціну, захапляліся грымам, але гэта была натуральная фізіяномія Курэйчыка, якая папросту апухла падчас здымак.

Андрэй Кавальчук грае ў трэцяй містэрыі вясковага старасту Яна, на якога палююць партызаны. У карціне створаныя вобразы сялянаў, галоўнымі атрыбутамі якіх зьяўляюцца ня лапці, каўтун і забітасьць, але годнасьць, зямля і свабода. Гэта і Адам зь першай містэрыі, і Ян, які зьбіраецца змагацца з камуністамі сам і пасынка свайго падвучвае, дый галоўны станоўчы пэрсанаж карціны — Якуб Лойка.

Якуб Лойка ў выкананьні Анатоля Кота — адзін з самых моцных, прывабных і шматабяцальных вобразаў беларускага кіно. Гэткі селянін-арыстакрат у капелюшы. Пабачыўшы яго, можна сказаць, што ў беларускага кіно не абы-які патэнцыял вэстэрнаў. Але ў гэтым фільме Кот заканамерна акцэнтуе ў сваім герою не тэхаскія, але заходнебеларускія рысы.

Якуб Лойка — патомны партызан. Ягоны прадзед сышоў ваяваць да Каліноўскага. Сцэна, дзе Якуб даходліва тлумачыць Штыркіну, супраць каго змагаўся ягоны прадзед, зрывае аплядысмэнты й сьмех.

Але горла сьціскаецца ў сцэне, дзе партызан Якуб мусіць забіць старасту Яна. «Ну што, братка, мы з табой тутэйшыя, самі разьбяромся. А я балюча не зраблю. Мы ж свае людзі…» Удзельнікі здымачнай групы нават плакалі. Вайна дасягае апатэозу, на экране мы бачым толькі людзкія твары — сьмерць жа ўваходзіць у чалавечае сэрца.

Пасьля гэтага нерухомееш і толькі бачыш, як нясуць соннага хлопчыка-пасынка (Ігар Пстыга). Той сам адчыніў дзьверы мсьціўцам, бо лічыў, што прыйшоў ягоны тата.

Напярэдадні хлопчык маліўся, каб бацька забраў яго з маці і «каб дзядзька Ян не перашкодзіў». Дзіця малілася сумленна й шчыра, сьціскаючы вінтоўку. Які час, такія і цацкі.

У гэтай гульні жыцьцё зьнікае, зьнікае мужчына, юнак, дзіця — і застаецца нямотны жаночы крык, які гучыць здранцьвелай мэлёдыяй на губным гармоніку ды шугае пажарам. І гэта ўжо ня роспач, а прысуд і ачышчэньне.

Застаецца дупло ў вялізным дубе, дзе прачынаецца пакінуты хлопчык. Ён бяжыць па сьнезе й крычыць тонкім сарваным голасам: «Тата! Тата!»

Карціна ўражвае пранізьлівым і суворым гуманізмам. Рэдка кіно размаўляе так, але гэтыя імгненьні найкаштоўнейшыя.

Нельга не адзначыць віртуозную працу гукарэжысэра й кампазытара Андрэя Волкава, які то жартуе акордамі з вэстэрнаў, то агортвае нас трывожнаю, амаль містычнаю атмасфэраю. Апэратар Павал Зубрыцкі стварае ілюзію кінастужкі, хаця фільм зроблены на лічбавым відэа; лёгкая камэра, панарамы і вывераныя статычныя кадры. Сучасная апэратарская кінамова.

> Беларускія рэплікі дублююцца «карэктнымі» расейскімі тытрамі: «А голас як у дупе волас» — «И голос тоже не очень».

Можна сказаць, што ў фільме ёсьць кадры зацягнутыя; што лепей было ў трэцяй містэрыі не дубляваць Ганну Пінкевіч (яе агучыла выкладчыца беларускай мовы), бо гэта робіць яе рэплікі занадта «правільнымі»; што лішнімі выглядаюць цытаты зь Біблії — архетыпічныя сытуацыі гавораць за сябе самі, — але ўсё гэта ня можа сапсаваць карціны.

Андрэй Кудзіненка іранічна гуляе з мовамі. Беларускія рэплікі дублююцца «карэктнымі» расейскімі тытрамі: «А голас як у дупе волас» — «И голос тоже не очень». «Я хацеў, каб людзі адчулі сакавітасьць беларускай мовы», — кажа рэжысэр.

Карціна надзвычай кінэматаграфічная, насычаная мітамі й размовамі пра кіно. Мільгаюць фатаздымкі Любові Арловай і Марлен Дзітрых, чуюцца сьпевы зь «Вясёлых хлопцаў» (сьпявае паліцай).

Фільм Андрэя Кудзіненкі — гэта моцнае гульнявое й арыгінальнае эўрапейскае кіно зь беларускім акцэнтам і тварам, з крынічнай хваляю беларускай акавіты. Шчэ на стадыі здымак карціна была запрошаная на прэстыжны Ратэрдамскі фэстываль, што адбудзецца ў студзені. Некалькі маскоўскіх відэакампаній, якія выпадкова пабачылі «Акупацыю», б’юцца за правы на яе продаж.

У Беларусі прэм’ера планавалася ў кінатэатры «Партызан». Але Саюз кінэматаграфістаў, які перайшоў на партызанскае становішча пасьля таго, як яго будынак заняў дзяржкантроль, збаяўся. Чыноўнікі — нават падчас здымак — намякалі на нейкі «пацыфізм» і «антыдзяржаўнасьць». Што ж, звычайная сытуацыя для Беларусі. Але ня вечная.

«Акупацыя» пачынаецца з праваслаўнага сьцьверджаньня: «Пяцьсот гадоў таму яны ня ведалі, што яны беларусы, але іх дзяржава была найбольшай у Эўропе. Калі яны даведаліся пра гэта, у іх ужо не было дзяржавы. Сто гадоў іх лічылі недаробленымі рускімі. Потым дванцаць гадоў — непаўнавартаснымі палякамі. Яшчэ два гады — савецкімі. А потым пачалася вайна і акупацыя. Пасьля іх беларусаў засталося зусім мала. Цяпер у беларусаў ёсьць дзяржава. Але іх саміх ужо няма».

Фільм даказвае адваротнае самым радыкальным чынам — праз незабыўную мастацкую вобразнасьць, праз сьцьвярджэньне сапраўднага беларускага кіно.

Акупацыі беларускай душы болей не існуе.

Беларускае кіно пачынаецца.

**Андрэй Расінскі**

## Усевалад ГАРАЧКА



* * *

Бог размаўляе з намі,
А мы не жадаем слухаць,
Крычым:
— Дзе Ты ёсьць?!
Адгукніся! —
І чуем уласныя словы.
А Бог размаўляе з намі,
І словы Яго — дзеі,
Але — мы Яго ня чуем.

* * *

Хачу быць вольным,
І зь лёгкасьцю,
Зь якой бы мог
Ступіць на іншы шлях,
Ісьці па гэтым.

## Андрэй АНАНЬЕЎ

### Фрагмэнт

... Колькі ты вінен ім за тое, што дагэтуль яшчэ жывы?
Табе не апраўдацца, табе не разьлічыцца, але сёньня ты паспрабуеш уцячы...
Хутчэй да кіёску, купляй білет на сумную ўскраіну гэтых вуліцаў.
Колькі ў цябе грошай? Аддавай усё, што ёсьць. Скажы: «Бяз рэшты». Вырывай свой білет і хутчэй у аўтобус, пакуль не заўважылі, колькі ты вінен...
І вось ты адзін на мяжы.
Вольны. Ці здолееш ты? Галоўнае — ня думаць і не спыняцца. Зрабі першы крок, потым другі, яшчэ адзін... падай. Бяжы.
Не спыняйся й не азірайся.
Твой напрамак проста на неба.
Твая дарога — бязьмежнае поле.
Вецер у тваіх валасах больш не сьпявае табе
калыханку.
Ён раве табе оду свабоды.
Толькі бяжы як мага хутчэй,
каб гэтая песьня зайграла гучней.
Чуеш, хлопча, што вецер пяе?
Словы яго ўзрываюць цябе.
Словы, якія цябе ратуюць,
словы, якія табе ўсё даруюць.
Гэтыя словы твае. Гэта ты:
Маладосьць!
Прыгажосьць!
Сьпеласьць!
Сіла ў руках!
Сонца ў вачах!
Сьмеласьць!
Здольнасьць!
Радасьць!
Непрадказальнасьць!
Неўтаймаваная экстрэмальнасьць!
Ты ўздымаешся на абрыў, а ўнізе рака цячэ. Позірк свой утапі ў нябёсах, рукі быццам крылы раскінь, набяры паветра поўныя грудзі і... КРЫЧЫ.

## Валерына КУСТАВА

* * *

Стаю адзін на разьлеглым пляцы.
На брукаванцы, напісаная крэйдай,
буйнымі літарамі
вымалёўваецца мая вера:
Я — беларус.
Сьветлавалосы хлапчук выбягае са школы
пасьля чарговае лекцыі роднай мовы,
на якой вучылі правапісу
мяккага знаку.
Уголас паўтарае правілы:
«Зьнявага — змаганьне — стагодзьдзе».
— Прабачце, у вас памылка, —
дакорліва ўсьміхаецца ён,
падымае кавалак адбітай чырвонай цэглы
і дамалёўвае значок да майго надпісу.
— Я — беларусь! — задаволена дэклямуе
маленькі настаўнік і весела шпацыруе далей.

І зноў я адзін на вялікім пляцы
Мо сапраўды
я адзін — народ,
я — беларусь,
я — краіна з маленькай літары?

## Зьміцер АРЦЮХ

* * *

Не магу адразу захапіць
У палон свой гарызонту нітку.
Два радкі... Гілевіча. Ім — жыць.
Мне ж — загінуць у вучнёўскім сшытку.

## Зьміцер ЗАХАРЭВІЧ

* * *

Восень. Бурштынавы строй ейнае праваты...
У памяці скрынях павольна вальсуе капэртамі лісьце,
На якім аповед пра лета ў праменьні чытаеш ты,
Абмежаваны ў сродках і магчымасьцях выйсьця.

Драпіны ўлева на хмарнае шкло кладзе вайстрыё —
Вадкі бруд вечару цурчыць у каралявы захад,
Ненаўмысна змываючы кветнае цела тваё
Зь непаўторным гаркавым чаборавым пахам.

Мы ўжо вызначаем жыцьцё паводле надвор'я,
А значыць, працяглай павінна быць крыза,
І птушкі цяпер зьбіраюцца ў краіны Міжземнамор'я —
Да сэзону наступнага адпачываюць валізы.

...Прыйшла, напаіла стыняй нагбом,
Ахапіла да часу ўсіх дрэмкім спакоем.
Я ж безнадзейна вылічваў над дымлівым агнём,
Чаго ня здолеў зрабіць сёлетняю вясною.

## Віялета ПАЧКОЎСКАЯ

* * *

Даўкі смак гарба...
Ты? Мг-м, так, ты... Несьвядома
цалую кубак.

* * *

Сіняя бездань.
Падаю ў твае вочы.
Больш не баюся.

* * *

Вішня ў квецені
скрала ў зімы эпітэт.
Постмадэрністка.

* * *

Гуляюся ў паэзію:
алоўкам на аркушах,
што трапляюць пад руку,
пішу ў цемры вершы.
А раніцай, якую так цярпліва
чакаю,
дзіўлюся: няўжо гэта і ёсьць
тое,
што ўначы было ТЫМ?



Кампазыцыя з мэталу «Дзяды». Каваль Юры Мацко

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Б.У.

### Насьледаваньне Шэкспіру

Кляну жыцьцё. Нясьцерпна бачыць мне,
як, выклік небу кінуўшы, нікчэмнасьць
шчыруе пры кіруючым стырне,
а годнасьць б'ецца ў высілках дарэмных;

як на вачах краіны ўсёй хлусьня
над праўдай пацяшаецца глумліва;
як жах жабрацтва множыцца штодня
і прадаецца ў роспачы цнатлівасьць;

як мова продкаў — скарб напеўных слоў —
чужынскай замяняецца дазваньня;
як палымяны заклік змагароў
у большасьці ня мае спачуваньня!

Так змрочна ўсё, што хоць спалі сябе...
Ды лепш сканаць у мужнай барацьбе!

Горадня

## Апанас ЦЫХУН

### Вятрак

Дзе калосьсяў жывы перазвон
Ў летні час пры дарозе зьнямелай,
Ён стаіць зь незапамятных дзён
Ў белай сьвітцы, ад часу счарнелай.

Збудаваў яго дзед безь цьвіка,
Змацаваў з дубу дошкі клінкамі —
На зьдзіўленьне ўсім мастакам
Змайстраваў залатымі рукамі.

Яго славіў лапцюжны народ...
Чорным бурам ён быў непакорны.
Час настаў, сонца новага ўсход —
І зьнямелі ў грудзёх яго жорны.

Над ім новыя песьні ляцяць,
Ў крылах чуецца ветру гамонка.
Шмат вам можа вятрак расказаць,
Як жыла раней наша старонка.

**Уладзіславу Ж.** Ваш «санэт» на зададзены першы радок — добры, але ж як санэт ня ўдаўся: усе магчымыя правілы складаньня санэтаў Вы парушылі.

**Юрасю Н. зь Менску**. Вашыя лімэрыкі — гэта хутчэй эпіграмы, але як на эпіграмы — даволі «бяззубыя». Мабыць, надта ж баяліся пакрыўдзіць адрасатаў! «Трызну» абавязкова надрукуем.

**Tasi**. Вельмі сымпатычныя хайку. Дасылайце яшчэ, каб было з чаго выбраць добрую падборку.

**S. P.-M. ź Miensku**. Вырашыце найперш для сябе: верш Вы пішаце альбо адкрыты ліст у Пэнтагон. Думаю, і першае, і другое паасобку ў Вас выйдзе лепей, чым дзьве гэтыя рэчы разам.

Вялікі дзякуй усім, хто даслаў свае творы! Нешта зь іх яшчэ зьявіцца ў «НН». Лістуйце.

З павагаю,

**Андрэй Хадановіч**

## Георгі ЛІХТАРОВІЧ

### Доўгая дарога...

Дадому, ды, лічы, да дамавіны
Агораў ён пакутна цяжкі шлях...
А іншым нават мёртвы Быкаў — жах.
І афіцыйна хлусілі навіны.

Дадаўшы да жалобы блытаніны,
Чыноўнікі схаваліся ў хмызах:
Як чорта ладан, напужаў іх сьцяг
Яго дасюль ня скоранай айчыны...

У касках гэтак званыя мужчыны,
Нібы гарох распараны ў струках,
Мадзелі дзень у тых грузавіках
І зыркалі, як жабы з каляіны.

Ды поўніўся людзьмі праспэкт Скарыны.
Такое будзе помніцца ў вяках:
Плыла труна павольна на руках,
Спыняліся сустрэчныя машыны.

І чуўся крык жалобны жураўліны
Ў падоўжаных нязладжаных гудках.
Ажно сінеча стыла ў васільках
Ад цеплыні апошняе даніны...

У безнадзейным суме той хвіліны
Узьняўся на крыло надзеі птах:
Народ ня будзе жыць у ланцугах —
Цяжар труны нам выпрастае сьпіны!..

Калі грудок зямлі, пяску і гліны
Схаваўся ў смутку, кветках і вянках,
Здалося, нават сосны на кладах
У роспачы схілілі вершаліны...

Але наўрад ці нашыя правіны
Закрэсьліць здольны крыж у галавах.
Насіць свайго прарока на руках
Мы пры жыцьці яшчэ былі павінны!

чэрвень—ліпень 2003

## Усевалад СЬЦЕБУРАКА

* * *

Ня леце гэты келіх поўны.
Мне кроплі хопіць, каб адчуць:
Скажу — ня схочаце пачуць.
Ня леце гэты келіх поўны.
Ён небясьпечны, як іртуць,
Сьмяротны для вар'ята поўні.
Ня леце гэты келіх поўны.
Мне кроплі хопіць, каб адчуць.

## Францішак В.

Ліцейны цэх,
Ён гатуе мэтал.
Ліцэйны сьмех,
Ён шматуе пыху.
Гранітны абрушыцца п'едэстал,
Калі ўзвышае ён помнік ліху.
Ліцэй беларускі,
Гартуе ён
Дух незацугляны й дужы.
Рунецьме плён
Няскораных дзён,
Адчыняцца,
Каб айчыніцца душы.
Ад ваўкалацтва
З усіх панацэй
Адзіная дзейсная панацэя —
Супрацьхалуйскі
Вяльможны ліцэй,
Дзе подласьці й здрадніцтва
Не сыцее.
Што ж, цемра сьляпая,
Гусьцей і люцей.
Даўно пад табой
Падгнівае калодзьдзе.
Жыве Беларусь!
(Чуеш ты, ліхадзей?)
Жыве Беларусі
Вольны ліцэй,
Пераходзячы
З стагодзьдзя ў стагодзьдзе!

## Тадэвуш Кандрусевіч,



мітрапаліт рыма-каталіцкіх парафіяў Расеі, магчыма, і ёсьць тым самым кардыналам «in pectore», якога Папа абвяшчае, не называючы да часу імя. У мітрапаліта толькі адзін рэальны канкурэнт — сакратар Яна Паўла II Станіслаў Дзівіш. Т.Кандрусевіч родам з Гарадзеншчыны, у 1989—91 г. ён узначальваў Беларускую каталіцкую дыяцэзію. Пасьля Ватыкан перавёў яго ў Расею. Праца а.Кандрусевіча — гэта і падарожжы па неабсяжных сібірскіх і далёкаўсходніх парафіях. Трэба быць у добрай фізычнай форме. Таму мітрапаліт не цураецца спорту: улетку — бег і футбол, узімку — лыжы і хакей.

## Пінчукі-каратысты

**Зьміцер Грачоў** і **Кірыл Пасавец** узялі бронзавыя мэдалі на Чэмпіянаце сьвету па каратэ ў Францыі. У агульнакамандным заліку беларусы 15-я. Каманда ехала ў Марсэль аўтобусам, за свой кошт. Не пасьпелі нават адпачыць як сьлед перад спаборніцтвамі. І ўсё адно вынік паказалі файны.

Бармэн **Аляксей Міхальчык** зь Менску — найлепшы па прафэсіі. Ён выйграў нацыянальны конкурс бармэнаў «Finlandia vodka cup» у намінацыі «клясычная прэзэнтацыя кактэйлю» (згатаваў самы смачны кактэйль, іншымі словамі). Усяго ў конкурсе ўзялі ўдзел 28 бармэнаў, сярод іх — упершыню дзьве дзяўчыны. Хай бы прыжываўся пакрысе культ нясьпешнага прыстойнага піцьця.

**Валеры Мазынскі** і **Яўген Крыжаноўскі** спыняюць сцэнічную дзейнасьць у Беларусі. Першы ліквідуе тэатар «Вольная сцэна» з прычыны невыноснага падатковага ціску. Другі з тае ж самае прычыны пераяжджае з сваім «Хрыстафорам» у Маскву.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Зьніклі з далягляду два най, большыя прыватныя тэатры.

**Міхаіл Гуцарыеў**, былы прэзыдэнт «Слаўнафты» і вялікі сябар беларускай улады, вяртаецца. Сумесная беларуска-расейская кампанія «БелРасНафтапрадукт» мае да канца году атрымаць у даверчае карыстаньне 25%+1 акцыяў Мазырскага нафтаперапрацоўчага заводу. Наўзамен урад атрымае такую ж долю акцыяў Гуцарыеўскае «Раснафты». Міркуецца, што такое супрацоўніцтва дасьць Беларусі магчымасьць здабываць нафту ў Расеі. Між тым, Крэмль усё пільней прыглядаецца да нафтавых магнатаў.

## Пуціну — Кукіс

Новым прэзыдэнтам ЮКА-Су, замест арыштаванага Міхаіла Хадаркоўскага, стаў малавядомы мэнэджэр **Сямён Кукіс**. Яшчэ за савецкімі ён эміграваў у ЗША і мае амэрыканскае грамадзянства. Генпракуратура РФ яго не дастане.

Прэзыдэнт Літвы **Раландас Паксас** — ахвяра шантажу.



Спэцслужбы перадалі ў Сойм рапарт, у якім яго дарадцу Рэмігіюса Ачаса вінавацяць у спрыяньні расейскай мафіі. Тая зь яго дапамогай нібыта зьбіралася гандляваць запчасткамі да вайсковых шрубалётаў. «Рухавіком праекту» называўся Юры Барысаў, галоўны спонсар перадвыбарчай кампаніі Паксаса. У панядзелак Сойм заслухаў запісы тэлефонных размоваў, у якіх Барысаў дамагаўся «выкананьня перадвыбарных абяцаньняў» — пасады галоўнага дарадцы прэзыдэнта.

**Джаан Роўлінг**, аўтарка кніжак пра Гары Потэра, запатрабавала ад выдаўцоў, каб яе новы раман выйшаў на паперы, выробленай з другаснай сыравіны. Пісьменьніца выступае ў абарону старых брытанскіх лясоў.

**Уладзімер Крышэнін**, лідэр выбарчага блёку «Расейская партыя пэнсіянэраў і Партыя сацыяльнае справядлівасьці», далёкі ад пэнсійнага ўзросту і пэнсіянэрскіх прыбыткаў. Паводле дэклярацыі, летась ён зарабіў 12.533.596 расейскіх рублёў (каля 400 тыс. даляраў).

**Нэстару Кіршнэру**, прэзыдэнту Аргентыны, прыходзіцца лётаць звычайным рэйсавым самалётам. Рабіць гэта даводзіцца ад нявыкруткі: двух сваіх пілётаў ён звольніў па абвінавачаньні ў махлярстве, трэці — на курсах у ЗША.

**СМ**

## ● ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ ●

### Якавенка ў родным ауле

**Імя гэтага мастака трывала заняло месца ў шэрагу вядомых беларускіх графікаў, такіх, як Савіч, Славук, Вішнеўскі.** Жыве Юры Якавенка ў Горадні, актыўна выстаўляецца. 31 кастрычніка яго прымала Полацкая мастацкая галерэя. На пачатку 90-х гарадзенскі маэстра афорту ўжо выстаўляўся ў Полацку — у прыватнай галерэі «Рыса». Той галерэі даўно няма, але імя Якавенкі палачане захавалі ў памяці. Добра ведаюць мастака і мясцовыя літаратары, бо ў 1996 г. ягонымі працамі быў праілюстраваны чацьверты нумар часопісу «Калосьсе».

Якавенка — ляўрэат шматлікіх міжнародных гран-пры, выстаўляецца ў Нямеччыне, Галяндыі, Гішпаніі. Але, як прызнаўся мастак на адкрыцьці полацкай выставы, згаджаецца з словамі Расула Гамзатава: нічога ня вартая слава творцы, калі яго ня ведаюць у родным ауле.

Таму Якавенка выстаўляецца ў розных гарадах Беларусі, хоць такія выставы з кожным годам патрабуюць усё большых матэрыяльных затратаў, а прыбытку не прыносяць.

Афорты Якавенкі — гэта маленькія філязофскія прытчы, трактаты, эсэ. У іх, з дапамогай пазнавальных сымбаляў, знакаў, «цытатаў» з сусьветна вядомых мастакоў, гарадзенскі маэстра апавядае пра свае адкрыцьці цудаў сьвету, якія хаваюцца за будзённасьцю жыцьця. Яго працы трэба ня толькі разглядаць, але й расшыфроўваць, расчытваць. Літаральна з Полацку Якавенка зьехаў у Галяндыю на адкрыцьцё сваёй камэрцыйнай выставы. Полацкая ж працягнецца месяц.

**Алесь Кебік**

### Выстава Драздовіча ў Маскве

**У Музэі наіўнага мастацтва ў Маскве (Саюзны праспэкт, 15а) 30 кастрычніка адчынілася выстава «Зямля і космас Язэпа Драздовіча».** Матэрыялы для экспазыцыі (дываны і графіка) у Маскву прыехалі з Заслаўскага гісторыка-культурнага музэю. Выстава працягнецца да 14 лістапада.

**АШ**

### Падарунак Ластоўскаму

**На месцы засьценку Калесьнікава (Плісскі сельсавет), дзе нарадзіўся Вацлаў Ластоўскі, расьце адзін-адзіны клён.** У Глыбокім нават няма вуліцы, названай у яго гонар. Несправядлівасьць выраўшылі часткова выправіць палачане. 8 лістапада, у дзень народзінаў Власта, у Полацку пры ўдзеле сяброў Таварыства вольных літаратараў адбудзецца імпрэза-акцыя. Велічнаму дубу, які расьце ў цэнтры гораду ля Дому афіцэраў (вул.Эўфрасіньні Полацкай), будзе нададзена імя Вацлава Ластоўскага. Пачатак імпрэзы ў 14.00.

**АА, Зьміцер Лупач**



УЛАДЗІМЕР ГРАБАВЫ

### Арганны фэстываль у Сафіі

**9 лістапада канцэртам нямецкага арганіста Яганэса Гюнтэра Кранэра ў Сафійскім саборы пачынаецца VIII Міжнародны фэстываль арганнай музыкі «Званы Сафіі».** Працягнецца ён да 7 сьнежня — за гэты час адбудзецца сем канцэртаў. Полацкая арганістка Ксенія Пагарэлая падрыхтавала праграму ў гонар 450-годзьдзя Рэфармацыі. Музыка той эпохі прагучыць у другой частцы яе выступу, а ў першай арганістка зайграе творы сучасных беларускіх кампазытараў: Кароткінай, Літвіноўскага, Давыдоўскай. Канцэрт К.Пагарэлай адбудзецца 16 лістапада. Расею на фэсьце прэзэнтуе ляўрэат сёлетняга арганнага фэстывалю «Гатчына—Менск» Яўген Аўраменка, Літву — Віргінія Сурвілайтэ, Польшчу — Кшыштаф Вількус, Украіну — Уладзімер Кашуба. Цана квітка на любы канцэрт — 5 тыс. руб.

**Тамаш Гурба, Полацак**

### ЦЫТАТНІК

Генэральны дырэктар УП «Менскводаканал» **Іосіф Герасімёнак**: «Менску моцна пашанцавала: за якасьць пітное вады ў сталіцы трэба дзякаваць Богу».

**Уладзімер Парфяновіч** адносна скасаваньня дэпутацкае групы «Рэспубліка» з прычыны недастатковае колькасьці сяброў: «Ведаеце, групавое згвалтаваньне, калі прысутнічаюць два чалавекі, — гэта ўжо група».

**СМ**

## ● ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ ●

Запрашаем на падарожжа **16 лістапада** (нядзеля) па маршруце: Менск — Барысаў — Талачын — Чарэя (Белая Царква) — Смаляны (замак-касьцёл) — Ворша (замчышча, манастыр) — Менск.

Т.: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер)

Т.: 264-12-38; 8-029-776-24-35 (Павал)

11 лістапада у 17.00 РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар» запрашае на прэзэнтацыю кнігі Алеся Аркуша «Прывід вясны» (вул. Казлова 7-101).

**ВІТАНЬНІ**

**Віншуем Бяльковіча Валер'я** з 50-годзьдзем. Жадаем шчасьця, здароўя і посьпехаў у жыцьці. Хросьнікі (Валер і Алеся)

**Валер'я і Жанну** Пуціцкіх віншуем з нараджэньнем дачушкі. Хай расьце дзіцятка на радасьць бацькам і на карысьць Бацькаўшчыне! Рэчыцкія сябры

**Іраіда!** Са сьвятам! Вас любіць Бог і мы таксама. Тыя, што разам ідуць да Храму

**Нястомную руплівіцу**, беларускага дойліда Іраіду Захараву віншуем з 50-годзьдзем! Сьвяткуем разам. Эскуляп, мікрабіёляг і паэт

**Іраіда**, з Народзінамі! Прымай дар сталасьці спакойна! Сяброўства ніву даглядай… Надзейныя сяброўкі

**Валечку Куўшынаву** з Народзінамі! Шчасьлівай долі і моцнай волі! Жыве Беларусь! Ты — лепшая! 63-21

**Лерачка**, віншую! Жадаю як мага менш падзеньняў, як мага больш радасьці, волі, чысьціні, сьвятла і любові. Крыска энд компані

**Шчыра віншуем** Валера Пуціцкага з нараджэньнем дачкі. Няхай заўсёды будзе здаровая і шчасьлівая. Рэчыцкая арганізацыя БНФ

**Endru,** з Днём народзінаў! Цмокі

**КАНТАКТЫ**

**Дарагая Іраіда!** Хатка з блакітным дахам пад чыстым небам ля вытокаў Вячы чакае Вас і чакае… Калі дачакаецца? Ганна

**Патрэбна** арганізацыйная дапамога ў адкрыцьці курсаў астралёгіі. Т.: 8-029-772-82-66 (нядзеля)

**Зьміцер Ц**., мы жадаем пабачыць тваё нармальнае чалавечае аблічча. Сваёй бязвольнасьцю ты ганьбіш сьвятое званьне Адраджэнца. Схамяніся, пакуль ня позна. Сябры

**Аналіз** эканамічных рэформаў у Беларусі — сучасны стан, пэрспэктывы. Т.: 8-029-672-27-18

**Запрашаем** усіх патрыётаў! Штočацьвер у 19.00 каля Купалаўскага тэатру. Мы любім Беларусь

**Купалавы чытаньні** каля помніка паэту з 14.00 да 16.00 штотыдзень у нядзелю. Падрыхтаваны матэрыял «Купала пра беларускую мову». Прыходзьце!

**КНІГІ**

**Апошнія нумары** часопісу «ARCHE» і беларускія кніжкі ў Баранавічах. Самыя малыя кошты ў Заходняй Беларусі. Т.: 8-029-767-20-37

**Беларускія часопісы**, кнігі, відэа, CD у Берасьці. Т.: 23-16-49

**Выданьне** «Скарб Думак» бясплатна на ТБМ. Каму ня хопіць — можна пачытаць тут у падшыўцы. Т.: 288-23-52

**Набуду** 1-ы том з 4-тамовага збору твораў Р.Барадуліна. Т.: 270-45-64

**Прадам** часопісы «Роднае слова» за 1996—2001 г. Т.: 270-45-64

**ПРАЦА**

**Шукаю сталае працы** альбо нясталае падпрацоўкі ў сфэры журналістыкі альбо рэдактуры. Добры заробак — mile widziany. Кепскі – таксама. Сьвятлана Курс. Т.: 8-029-643-98-66

**Рамонт** GSM-тэлефонаў, правадных і радыётэлефонаў, факсаў, тэле-, відэа-, аўдыё, бытавой тэхнікі, кампутараў. Т.: 222-27-18

**Пераклады** зь нямецкае мовы, кантрольныя работы хутка і якасна. Т.: 8-029-766-12-79. Зьмітрусь

**Вучу** танцам індывідуальна і ў групах. Т.: 8-029-636-43-08. Вольга

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам A2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3423. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 5.11.2003.
Замова № 5905.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а